Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2875) Год LVI | Беласток, 19 чэрвеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Няхай вынікі будуць найлепшыя

Размова з ***Эвай Камінскай-Гаўрылюк****, дырэктаркай беластоцкай дэлегатуры Галоўнай статыстычнай установы ў Беластоку.*

„Ніва”: ***— Ці давяраеце падляшскім перапісчыкам?***

Эва Камінская-Гаўрылюк: — Так. Гэта людзі выбраныя войтамі і бурмістрамі. Мусілі іх выбраць з ліку асоб з сама меней сярэдняй адукацыяй, выклікаючых давер. Быў яшчэ там шэраг іншых крытэрыяў, але адным з найважнейшых было тое, каб выклікалі яны давер.

— Што гэта значыць „каб выклікалі давер”?

— Па-першае, не могуць яны быць пакаранымі. Па-другое, гэта людзі выбіраныя ў малых грамадствах, у якіх агульна ўсе ведаюць адны адных. Перапісчыкі апрача таго абучаны і была ім звернута асаблівая ўвага м.інш. на тое, што будуць пытанні пра нацыянальнасць, мову ці веравызнанне. Ведаюць, што мусяць ставіць усе пытанні і ўсе яны важныя. Усе яны маюць па генд-гельдзе [мініяцюрным электронным прыборы — М. Х.] і праграма, якая там уведзеная, вядзе іх па адпаведнай сцежцы. Чарговыя пытанні на гэтым прыборы высвечваюцца ім і перапісчыкі маюць абавязак па чарзе ставіць гэтыя пытанні і адзначаць адказы.

— А як гэта здарылася, што ў выпадку спадарыні Клаўдзіі Прымакі з-пад Шудзялава і іншых рэспандэнтаў, якія паскардзіліся Радыё Рацыя і „Ніве”, не ставілася пытання пра нацыянальнасць і мову?

— Гэтага я не ведаю. У выпадку пані Прымакі — я паехала ў Шудзялава. Пераспісчыца, якая яе перапісвала, сцвярджала, што не паспела паставіць пытання пра нацыянальнасць і мову, бо раней спыталіся ў яе, чаму іх не паставіла. У сваю чаргу дачка пані Клаўдзіі Прымакі сцвярджала, што спыталася пра гэта, калі перапісчыца ўжо выходзіла. Мяне не было там на месцы і цяжка мне гэтую сітуацыю ацаніць адназначна.

— Колькі асоб „спраўдзіла” перапісчыца, якая трапіла да Клаўдзіі Прымакі?

— Я не правярала гэтага. Гэтая перапісчыца ўжо поўнасцю адхілена ад перапісу. Адразу як толькі даведалася я пра гэтую сітуацыю, я папрасіла ў войта, каб адабраць у яе пасведчанне і генд-гельд.

— Ці Вам вядома, колькі парушэнняў магла зрабіць гэтая перапісчыца?

— Праверу гэта. Мушу сказаць, што калі я з ёю размаўляла, была яна гэтым вельмі ўсхваляваная і не выглядала на асобу, якая наўмысна хацела б штосьці ў час перапісу сфальшаваць. Гэта, вядома, толькі маё ўражанне.

— Адкуль у Вашых шудзялаўскіх выказваннях перакананне, што шудзялаўскі выпадак гэта адзіны такі?

— Да мяне дайшла інфармацыя толькі аб адным і гэта дзякуючы журналістцы Тэлебачання Беласток. Я думаю, што калі хтосьці ставіць абвінавачанні, паінфармуе мяне аб гэтым асабіста, бо я дэфакта аб іншых выпадках парушэнняў не ведаю.

— Ці паведамленні СМІ аб выпадках перапісных парушэнняў ёсць, або не, для Вас крыніцай інфармацыі?

— Я за тое, каб аб такіх выпадках інфармаваць мяне непасрэдна. Справа ж у тым, каб сітуацыю выправіць. Адрасатам такой інфармацыі перш за ўсё павінна быць я. Не кажу, што нядобра, што ў справе пані Прымакі былі паінфармаваны СМІ. Пытаюся толькі чаму ў першую чаргу не паведамілі мяне аб гэтым.

— Ці ГСУ мае нейкія прылады, каб праверыць сапраўднасць інфармацый заношаных перапісчыкамі?

— Напэўна правяраем лагічнасць спалучэнняў паміж данымі. Апрача таго паміж 1 і 11 ліпеня адбудзецца кантрольны перапіс, у якім частка выпадкова выбранай папуляцыі будзе адказваць на перапісныя пытанні, значыць, дэ-факта адбудзецца паўторны перапіс.

— Як можна праверыць, што ўпісвае ў апытальнік перапісчык, які перапісвае нас па тэлефоне?

— Гэтага не праверыцца. Мусім давяраць адзін аднаму. Інтэрв’юерамі перапісваючымі па тэлефоне з’яўляюцца ключна работнікі ГСУ. Яны, больш яшчэ чым перапісчыкі, ведаюць як правесці перапіс.

— Як гэта сталася, што калі да пані Прымакі пазваніў працаўнік ГСУ, аказалася, што незалежна ад таго, што дэкларавала яна канчаткова беларускую нацыянальнасць, ёй упісалі польскую нацыянальнасць?

— Работнікі ГСУ маюць такую колькасць тэлефонных апытальнікаў, што не змогуць спамятаць, што ўпісвалі ў кожным з іх. Аднак, вызначыць гэта можна.

— Значыць, будзе гэта вызначана?

— Спрабую гэта вызначыць.

— Якую частку насельніцтва ахопіць паўторны перапіс?

— У гэты момант не памятаю.

— А ці будуць паўтарацца пытанні пра нацыянальнасць, мову, веравызнанне?

— Будуць ставіцца ўсе пытанні ў выпадкова выбраных кватэрах.

— Ці ў час абучэнняў і пасля экзаменаў гаварылася дэталёва інтэрв’юерам наконт таго, у які спосаб ставіць пытанні, напрыклад, пра нацыянальнасць?

— Цяжка мне ў гэты момант прывесці, што ў той час гаварылася. Абучалі працаўнікі нашай установы. Кіравала гэтым працаўніца, якая таксама ўдзельнічала ў папярэднім перапісе і напэўна было адзначана, што маюць ставіць усе пытанні, асабліва таму, што пры папярэднім перапісе сустрэліся мы з падобнымі абвінавачаннямі.

— Ці, як гэта кажуць нашы чытачы і слухачы Радыё Рацыя, ёсць магчымым, каб перапісчыкі ставілі пытанні з намёкам, напр.: „Пан/пані, вядома, польскай нацыянальнасці”?

— Не, гэта немагчыма, а напэўна абсалютна недазволена. Нельга ніякім чынам мадыфікаваць перапісныя пытанні. Перапісчыкам нельга на нішто намякаць. Аб гэтым таксама інфармавалася іх на абучэннях.

— У Зіны Сэльвэсюк з Бельска-Падляшскага ў час перапісу па тэлефоне спыталіся, ці яе нацыянальнасць такая самая як у папярэднім перапісе. Адкуль такія веды ў інтэрв’юера?

— Не ведаю. Усе даныя ахоўваюцца. Ніколі не было выпадкаў, каб з ГСУ выплылі перапісныя даныя. Немагчыма, каб інтэрв’юеры ведалі інфармацыі аб апытаных асобах з папярэдняга перапісу.

— Што ГСУ намерваецца зрабіць з гэтымі ўсімі выпадкамі парушэнняў у час перапісу?

— Яшчэ не ведаю. Мушу пракансультавацца ў гэтай справе з праектантамі перапісу. Апрача таго не ведаю ці гэты адзін ці нават больш за дзесяць выпадкаў будуць мець уплыў на вынік перапісу ў цэласці. Не ведаю як гэта ацаніць. Усім перапісчыкам мы яшчэ раз прыпомнілі як маюць сябе паводзіць.

— Ці адчуваеце віну за парушэнні ў час перапісу адносна пытанняў пра нацыянальнасць і мову?

— (*Маўчанне*) Не ведаю. Напэўна я не хацела б, каб такая сітуацыя мела месца. Раблю ўсё, каб такога не было.

— Як Вы думаеце, чаму для нацыянальных меншасцей перапісныя пытанні пра нацыянальнасць і мову з’яўляюцца такімі важнымі?

— Гэтая ацэнка не належыць мне. Мая роля — правядзенне перапісу так, каб вынікі былі як найлепшыя.

— Што гэта значыць „як найлепшыя”?

— Гэта значыць, каб атрымаць дакладнае адлюстраванне польскага грамадства.

— На канец статыстычнае пытанне. Колькі беларусаў у Польшчы?

— Не ведаю. Гэта будзе вядома пасля перапісу.

— Я пытаюся пра вынікі апошняга перапісу ад 2002 года.

— Не памятаю.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Просім нашых чытачоў інфармаваць рэдакцыю пра вядомыя Вам і Вашым знаёмым прыклады парушэнняў у правядзенні перапісу. Калі ласка, звоніце нам па тэлефоне: 857435022 або пішыце на адрас рэдакцыі. Нашы журналісты адгукнуцца на Вашы лісты і званкі ды скантактуюцца з Вамі.

9 770546 196000

Новая эканамічная логіка

Калі праз гады эканамістам і даследчыкам трапіць у рукі графік падзення і пад'ёму коштаў на паліва ў Беларусі за апошні тыдзень, то яны напэўна будуць узмоцнена мазгаваць пра тое, якія эканамічныя цуды так падкідвалі і апускалі тыя кошты і якой логікай у гэты час кіраваўся рынак. Прычым, першую палову гэтага эканамічнага красворда разгадаць будзе нескладана — падняліся долар, еўра, расійскі рубель і польскі злоты (ці калі сказаць карацей і не пералічваць усе грашовыя адзінкі свету, уключаючы ў пералік не толькі англійскія фунты, ізраільскія шэкелі, але нават і мангольскія тугрыкі, то проста ўпаў беларускі рубель). Гэта ўсё значыць, што падняліся і кошты на энерганосьбіты. І, здаецца, падняліся адпаведна валюце, застаючыся пры гэтым не самымі дарагімі ў рэгіёне. Нічога не зробіш, энерганосьбіты, тым ці іншым чынам, неяк прывязаныя да цвёрдай валюты. Пытанне ў іншым: чаму кошты раптам знізіліся? Дзе там логіка?

Логікі ніхто шукаць не стаў. Папросту, начальнік беларускай дзяржавы сабраў нейкую нараду, дзе і заявіў, што бензін будзе каштаваць вось столькі ды столькі. Спецыялістам па эканоміцы засталося толькі ўзяць калькулятары і правесці нескладаную аперацыю з націсканнем кнопак на той лічыльнай машынцы, каб, зыходзячы з агучанага кошту, палічыць колькі будуць каштаваць меншактанавыя маркі бензіну і салярка. Тут узнікае яшчэ адно пытанне: навошта патрэбныя тыя высокааплачваемыя спецыялісты, бо падобны падлік можа правесці не толькі кожны настаўнік матэматыкі пачатковых класаў, але і самы горшы вучань такога класа? Нашто ў гэты эканамічна складаны час трымаць высокааплачваныя штаты спецыялістаў і міністраў, калі яны самі не могуць вызначыць эканамічную мэтазгоднасць коштаў на энерганосьбіты?

Далей эканамічных загадак не паменшала. Паколькі работу з коштаўтварэннем за адмыслова пастаўленых для гэтага спецыялістаў і дзяржаўных служачых зрабіў іншы чалавек, яны хіба заняліся вывучэннем гісторыі дваццацігадовай даўніны і пайшлі тым самым шляхам, які некалі прыкончыў Савецкі Саюз. А менавіта пачалі абмяжоўваць вываз паліва і іншых прадуктаў з краіны. Чаму, таксама ніхто не тлумачыць. Здаецца, нават пры абніжаных коштах бензін у нас не ёсць датацыйным таварам. Яго продаж прыносіць прыбытак. Гэта азначае, што чым больш яго прадаць, тым больш прыбытку казна мае. Але хіба казну не прыбытак цікавіць. Казна, хіба што, здабываць прыбытак такім шляхам ужо развучылася. Таму да абмежавання на вываз трапіла не толькі паліва, нейкія крупы, мясныя кансервы, але нават і цыгарэты.

Кожны ведае, што цыгарэты — тавар акцызны. Пакупнік гэтай атруты плаціць не толькі за сам прадукт, не толькі дае прыбытак вытворцу, але яшчэ аплачвае акцыз. Гаворачы мовай больш зразумелай, плаціць ні за што. Кожная краіна ў свеце здзірае гэтыя грошы са спажыўцоў падобнага тавару як кампраміс за тое, што дазваляе добраахвотна грамадзянам сябе атручваць. У народзе акцыз называюць платай за шкодныя звычкі. І паколькі ў бюджэт ідуць з цыгарэт шалёныя грошы, кожная краіна стараецца пабольш гэтага тавару прадаць іншаземцам, і ні ў якім выпадку не прапусціць на свой рынак гэтага прадукту чужой вытворчасці.

Ды і ўвогуле кожная краіна зацікаўленая ў вывазе са сваёй тэрыторыі максімальна большай колькасці сваіх тавараў. Калі вываз перавышае ўвоз, гэта і лічыцца здабыткам кожнай эканамічнай сістэмы. Таму, калі вывозіш тавар, прыкладам з Польшчы, яны яшчэ амаль пятую частку ад затрачаных на пакупкі грошай вяртаюць. Абы тавар купілі і вывезлі. Яны там самі сабе яшчэ наробяць. А ў нас, аказваецца, нават цыгарэты могуць скончыцца.

Адным словам, новая эксперыментальная эканамічная мадэль нарэшце набыла новую эканамічную эксперыментальную логіку свайго функцыянавання. Толькі ўсё новае гэта даўно забытае старое. І напрыканцы васьмідзесятых мы ўжо абаранялі такім чынам свой спажывецкі рынак. Што з гэтага атрымалася, усе ведаюць. Толькі не ўсе робяць высновы.

Віктар САЗОНАЎ

Быць як паўночны алень

Не без прычыны сягнуў я чарговы раз па кніжку, дзякуючы якой зноў магу папаломнічаць па Сібіры — „Дневники одного года" Лебедзева, Сімчанкі, Старосціна, аб іх этнаграфічным паходзе на далёкую Поўнач, на раку Таз, дзе жывуць селькупы, паляўнічыя на паўночных аленяў, пабрацімы ненцаў (перад савецкай рэвалюцыяй — самаедаў), эвенкаў (тунгузаў), хантаў, асцякоў і г.д. Кажу не без прычыны, таму што засумаваў я па чыстым, непадманным свеце, сапраўдным, што не значыць, што ён утапічны. Тут прашу прабачэння ў чытача за гэтую наіўную тыраду. Ды стамілі мяне шматзначныя, складаныя ды шораз больш шматзначныя паняцці, якімі карыстаемся ў штодзённічыне, і за імі яшчэ больш складаныя міжчалавечыя адносіны. Кажучы проста: засумаваў я па тым, чаго шораз менш у нашым недаверлівым свеце, а за што так горача заступаўся адзін Месія, калі казаў, каб „так" значыла „так", а „не" — „не."

У кніжцы, пра якую тут гаворка, мноства інфармацый: аб тым як селькупы будуюць сані, як летнія палаткі, а як зімовае жыллё-зямлянкі. Ды ўварвалася паміж вучоныя старонкі паэзія; Ясенін: „И, каждую березку обнимая, я был пьяней, чем синий день".

Селькупы вершаў не пішуць, свой эмацыянальны стасунак да акаляючага свету выказваюць у песні інспіраванай рэччу або з'явай, якую назіраюць у даны момант. Таму іх лірыка пра бярозу гучыць так: „Я знайшоў добрую бярозу, мае яна гладкі пень і мала сучча, выйдзе з яе добры нюк" („нюк" гэта скураная сцяна „чума" — летняга шалаша).

Таму абмяркоўваць з селькупамі складаныя пытанні немагчыма. Напрыклад, аб сэнсе жыцця. Бо пытанняў абстрактных селькупу нельга ўвогуле ставіць. Як кажуць аўтары кнігі, гэтыя людзі думаюць канкрэтна. Напрыклад, не ведаюць паняцца „снег". Каб яго акрэсліць, служаць два дзесяткі іншых слоў. Снег жа бывае розны, як хоць бы „шуга" — першы асенні снег, звыклай велічыні і пры сярэдняй сіле ветру; чым большы вецер, тым таўсцей скрышталізаваны снег і іншая ў яго назва. У селькупаў і ўвогуле на Поўначы няма слова „паўночны алень". Ёсць цяля, бычок або важэнка (самка паўночнага аленя), ёсць адналетак, двухлетак, прыручаны, дзікі, хаптарка (самка, якая яшэ не нараджала).

Падобна і з ежай — харчаванне не з'яўляецца для селькупаў абстрактным дзеяннем, гэта заўсёды спажыванне чагосьці. А дэталі маюць свае назвы. Напрыклад, селькупы не „ядуць" сырога мяса ці рыбы, толькі „сагудаюць" іх, што прыпісана толькі гэтаму, канкрэтнаму сыраму харчу; інакш называецца спажыванне варанага мяса. Таму мала канкрэтныя пытанні застаюцца без адказу. Сярод селькупаў няма таксама „ветлівых" слоў тыпу „добры дзень, да пабачэння, калі ласка, жадаю поспехаў"... Яны іх паказваюць дзеяннем — дык нашто іх выказваць?

— Бывае, што ў дарозе трэба адпачыць. Вандроўнік моўчкі ўваходзіць у першы напатканы „чум", сядае ў дакладна акрэсленым месцы — прызначаным толькі для гасцей — і чакае. Без лішніх слоў гаспадары ставяць перад ім чай і ежу. Прыбыўшы есць і п'е. А калі насыціцца і пагрэецца, устае і выходзіць. І ўсе яны шчаслівыя. Гаспадар таму, што падзяліўся з вандроўцам стравай і цяплом агню. Бо калі мог падзяліцца, значыць меў чым, а калі меў чым, значыць — ён шчаслівы. Госць таксама шчаслівы, бо з поўным страўнікам, абагрэты, можа вярнуцца на шлях. Добра быць на шляху.

А наконт паўночных аленяў: на іхніх ілбах, зараз за вухам, ёсць малы бугарок. Селькупы нызваюць яго „мозгам".

— Добры той паўночны алень у вупражцы, — кажуць, — які бяжыць і памірае ў дарозе. Трэба заўжды глядзець, колькі ў яго „мозгу". Калі „мозгу" ў яго замала, падае мёртвым. Паўночны алень не прыстане, не адпачне, бяжыць, а калі спыніцца, значыць, што будзе памірацьь. Тады такога аленя трэба кінуць. Бо бывае, што ўстане. А калі ўстане, дык вернецца. А калі не — дык яму ўжо канцы.

Ды чаго яшчэ хацець ад жыцця?

Эх, люблю я паўночных аленяў.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Перапіс кантраляваны?

Пытанняў пра нацыянальнасць і мову, якою карыстаемся, не паставіла не толькі перапісчыца ў Шудзялаўскай гміне. З інфармацый Радыё Рацыя і „Нівы" вынікае, што да гэтай пары ў рамках нацыянальнага перапісу такіх выпадкаў было больш. Ды вернемся да пачатку. Два тыдні таму ў эфіры Тэлебачання Беласток Агнешка Прымака-Байко паскардзілася, што яе маці Клаўдзія Прымака з хутара Кнышэвічы спачатку не пачула ад перапісчыцы пытанняў пра нацыянальнасць і мову, якой карыстаецца штодзень, а пасля даведалася, што ў апытальнік занесены адказ нязгодны з яе заявай.

— Зацікавіла мяне, чаму перапісчыца ўпісвае даныя ў сшытак, — гаварыла Беластоцкаму тэлебачанню Агнешка Прымака-Байко. — Сказала, што сістэма „завесілася".

На патрабаванне тлумачэнняў, чаму перапісчыца не паставіла пытанняў пра нацыянальнасць і мову, тая мела адказаць: „Przecież mieszkamy w Polsce, więc wszyscy jesteśmy Polakami". Абедзве жанчыны патрабавалі занясення ў анкету Клаўдзіі Прымака беларускай нацыянальнасці ды беларускай і польскай моў. Больш за дзесяць дзён пасля пазванілі ім з Галоўнай статыстычнай установы (ГСУ). Аказалася, што гэтая анкета запоўнена не да канца. Выявілася таксама, што ў рубрыцы „нацыянальнасць" была ўпісаная польская. Эва Камінская-Гаўрылюк, дырэктар ГСУ ў Беластоку, пасля тэлеперадачы, задзейнічала. Перш за ўсё адхіліла перапісчыцу ад абавязкаў. Прытым аднак дадала: „Няма зусім іншых сігналаў наконт таго, каб у гэтым перапісе адбывалася штосьці кепскае. Да гэтай пары гэта быў адзіны выпадак, адзіны сігнал, адзіная інфармацыя пра няправільнасці".

Зараз пасля з'яўлення ў тэлеэфіры матэрыялу датычнага Клаўдзіі Прымакі, у Радыё Рацыя разваніліся тэлефоны ад асоб, якія сцвярджалі, што і ў іх таксама не пыталіся пра нацыянальнасць і (або) мову, а таксама некаторыя казалі, што і пра веравызнанне (адказ на гэтае пытанне — дабравольны). Таксама ў „Ніве" чытачы скардзіліся на падобныя выпадкі. Былі таксама такія, калі перапісчыкі намякалі нам адказ:

— Перапісчыца пыталася: „Język?" і сама адказвала: „Oczywiście, język polski", — успамінала ў Радыё Рацыя свой досвед Ірэна Парфянюк з Гайнаўкі.

Цікавы досвед у сваю чаргу мела Марыя Балтрамюк таксама з Гайнаўкі, якую перапісчыца ўпарта ўгаворвала, што яна ўкраінскай нацыянальнасці.

— Калі я адказала, што гавару „па-свойму", дык яна на тое, што, можа, па-ўкраінску.

Ян Целушэцкі, солтыс Новага Ляўкова, прызнаўся нам: „Пытанняў пра мову і веравызнанне мне не паставілі".

Такія выпадкі да сёння зафіксаваны былі, напрыклад, у Бельску-Падляшскім і ў ваколіцах Чыжоў. Тут таксама „цікава" праводзіўся перапіс па тэлефоне. У вядомых нам выпадках або ўвогуле не прагучала пытанне пра мову і веравызнанне, або перапісчыкі прасілі пацвердзіць польскую нацыянальнасць.

Пасля выяўлення перапісных няправільнасцей у Клаўдзіі Прымакі, паявілася ў яе хаце дырэктарка Камінская-Гаўрылюк. Дачка апытальніцы ўспамінае гэты візіт: „Спадарыня дырэктар не вельмі падабалася, што гэтая справа трапіла ў СМІ".

У кантэксце выпадку Клаўдзіі Прымакі, але і іншых, цікавым мне здаўся фрагмент каментара ў Радыё Рацыя Кастуся Бандарука (які родам, як і сям'я Прымакаў, з Шудзялаўскай гміны): „Паменшванне колькасці беларусаў любым чынам: свядома ці несвядома, шкодзіць ім як нацыянальнай меншасці, маргіналізуе іх, адбірае ім пачуццё значнасці і паўнацэннасці. Яно дае падставу абмежаваць дзяржаўную падтрымку беларускім арганізацыям, медыям і школьніцтву. Маўляў, вас мала!".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

САКРЭТЫ ПРАВАДЫРОЎ

У Храбустоўцы пры скрыжаванні нарваўска-гайнаўскай шашы з вясковай вуліцай стаяць у агароджы два рэлігійныя помнікі. Адзін у выглядзе драўлянай каплічкі са шматлікімі маршчынамі на аснове і абразам нейкага святога ў ківорце; каплічка накрыта бляшаным дахам, над якім металічны просты крыжык у калысцы кшталту маладзіка. Другі помнік цэментны з выразна адмаляваным праваслаўным крыжам на пастаменце. Помнікі стаяць у суправаджэнні трох мажных клёнаў — усе яны абведзены акуратным металічным плотам.

З другога боку вуліцы чалавек некага чакае. На маё пытанне пра крыжы адказвае па-польску, што ён з Васькоў, а пра храбустоўскія асаблівасці трэба спытацца ў кагосьці мясцовага. Неўзабаве паказваецца іншы мужчына, з касою і веласіпедам, які заходзіць на панадворак насупраць крыжоў. Пра крыжы ён дакладна нічога канкрэтнага не ўмее сказаць — за гэтай інфармацыяй раіць мне падацца на вёску да мясцовага васьмідзесяцігадовага старажыла, але я свой маршрут запланаваў у іншым напрамку, да таго ж скептычна ацаніў я магчымасць атрымання больш канкрэтнай інфармацыі пра аб'екты мясцовай даўніны, бо ў вясковай памяці такая інфармацыя рэдка калі захоўваецца. Спытаў я яшчэ, ці трэшчыны ў стварах кляноў мо ад нейкага грому, але не ад грому яны, толькі ад марозу.

Мой субяседнік раіў мне яшчэ сфатаграфаваць недалёкія будынкі ў развальным стане, інфармуючы, што так гаспадарыць саракагадовы кавалер, які трымае яшчэ і каля дзесяці не надта дагледжаных кароў. Я, аднак, адказаў, што да такога гаспадара, які ў адзіночку, з-за неахвоты дзяўчат заставацца на вёсцы, усё ж такі стараецца як умее гаспадарыць, трэба ставіцца з пашанай. Субяседнік адказаў мне, што ён не насміхаецца з суседа і дадаў, што той сусед вельмі спакойнага характару, нікуды яму не спешна, ці то дождж ідзе, ці сонца свеціць...

З Храбустоўкі ў Ваські недалёка, дарожны паказальнік падае адзін кіламетр. Дарога між гэтымі вёскамі пад асфальтавым палатном, паабапал яе растуць мажныя таполі. Пад пяцьдзесят гэтых дрэў пазначаныя да высечкі; мо іх намеціла запаветная недалёкая Ікея.

Даходжу да Васькоў. З лясной дарожкі з боку Макаўкі паказваецца пажылая жанчына, якая вядзе веласіпед, загружаны двума мяшкамі і двума байкаватымі сасновымі сукамі. У адным з мяшкоў крапіва; даведваюся, што зёлкі збіраюць тыя жыхары Васькоў, якія яшчэ маюць сілы і не лянуюцца. Пытаю яшчэ пра дарогу да помніка расстраляным гітлераўцамі жыхарам Нарваўскай гміны, што за вёскай у Лядскай пушчы і спыняюся каля вясковага цэментнага крыжа, што насупраць апусцелай майсенеўскай крамы; на маё пытанне, калі тую краму закрылі, жанчына адказвае: „Ой!" і хуценька аддаляецца ад мяне — непрадбачванага ёю размоўцы...

Згаданы будынак былой крамы аздоблены яшчэ шыльдай ды напісанымі шпрэем на дзвярах і сцяне аб'явамі пра яго продаж. На адным з акон красуецца выбарчы плакат нядаўняга войта Нарваўскай гміны Якуба Садоўскага; плакат гэты цікавы выбарчым лозунгам: „Rytajcie o mnie u swoich przywódców". Галоўнае ў нас — меркаванне правадыроў. Мой дзед даведку пра нейкага чалавека пачынаў з пытання, які ў яго чын. Прыгонны атавізм беларуса (не пра былога войта тут мова, але пра мясцовы электарат, на які плакат разлічаны) здаецца быць неўміручым...

Гэтакі атавізм нажывалі многія пакаленні. У гэтым ракурсе паказальны і лёс найбольш вядомага ўраджэнца Васькоў Мацвея Лавіцкага, хаця ведаюць пра яго пэўна нямногія. Нарадзіўся ён 195 гадоў таму, у 1816 годзе ў Васьках менавіта. Выводзіўся ён са збяднелай шляхецкай сям'і каталіцкага веравызнання. Прывяду тут некалькі вытрымак з прысвечанага яму артыкула Ежы Шумскага, змешчанага ў 8-м нумары часопіса „Białostoczyzna" з 1987 года: „W wieku 8 lat Łowicki został wysłany do ciotki — żony księdza greckokatolickiego w pobliskim miasteczku. Jeżeli tym miasteczkiem była Narew, to przebywał w domu księdza Atanazego Łopuszyńskiego — parocha unickiej parafii narewskiej od 1815 r. Tam nauczył się dobrze czytać po polsku, słabiej po rosyjsku i łacinie, trochę pisać a także służyć do mszy. W skali lokalnej wyznawcy obudwu kościołów na ogół zgodnie współżyli. Częstym zjawiskiem było np. przyjmowanie sakramentów z rąk księży

Крыжы з вязавым ствалом

unickich przez łacińskich katolików i odwrotnie. Edukacja w domu księdza unickiego zapewne spowodowała, że w przyszłości Łowicki wyróżniał duchowieństwo tego kościoła. Np. w gimnazjum spowiadał się chętniej u księży unitów aniżeli u rzymsko-katolickich". У пачатку 1827 года маці адвезла Мацвея ў парафіяльную школку ў Заблудаў, якую ён закончыў у наступным годзе і пайшоў далей вучыцца ў гімназію ў Беласток. У 1834 годзе пачынае навуку ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, якую завяршае 4 жніўня 1839 года.

У час штудыяў, у 1836 годзе Лавіцкі становіцца сябрам радыкальнай студэнцкай арганізацыі Дэмакратычнае таварыства, заснаванай ураджэнцам Піншчыны Францішкам Савічам. Лавіцкі ў гэтай арганізацыі вёў сябе стрымана; інакш справы склаліся ў Савіча, які ў духу рамантызму не цураўся сваёй палескай гаворкі. Вось фрагмент ягонага верша: „Гдзе ж ся подзілы эты давны літы, /Шчо мы за власны грошы соль куплялы, /Шчо бэз пашпорту ідзі хоць в край світа, /Шчо мы Москаля і в очы нэ зналы! /Гдзе кінеш — радасць музыкі іграюць, /Мёд, піва льется, дзевчата гуляют. /А тут шынкарка частуе прыгожа: /Тагды то Польшча свяцілася Божа! /Малы падаткі — грошы як мякіны, /У хляве каровы, бычкі, свіні, /У каморэ поўна, хоць спі на своях, /У хаце чысценька, як в паньскіх пакоях. /Так то бывало ў нас і між вамі! /А цяпер гдзе ж тые шчасце ся подзіло? /Гдзе глянеш — люде брашчат ланьцугамі, /Гдзе кінеш — слёзы, аж жыты не міло, /Бо з чэловіка высысают сілы — /А всё то цары Москалі зробілы". Савіч быў сасланы радавым салдатам на Каўказ, адкуль уцёк на Украіну, дзе і памёр пражыўхы ўсяго 31 год...

Лавіцкага арыштоўваюць 6 кастрычніка 1840 года ў Адэсе, дзе ён быў атрымаў працу ваеннага лекара, саджаюць на год у віленскую турму і 2 снежня 1841 года прысуджаюць да ссылкі ў Сібір. Працуе ў Краснаярску, Чыце, Омску, піша артыкулы ў літаратурныя і навуковыя часопісы. У 1858 годзе атрымлівае дазвол вярнуцца на радзіму. З 1859 да 1864 года працуе лекарам у Коўне і Беластоку. Крыху раней, у 1853 годзе, купіў ён маёнтак у Нурчыку, што каля Мілейчыч і сюды перабраўся ў 1865 годзе, дзе і памёр 3 мая 1900 года.

Шумскі піша: „Maciej Łowicki przeszedł dość typową ewolucję poglądów: od młodzieńczego radykalizmu, korzeniami tkwiącego w oświeceniowej tradycji, do postawy patriotyczno-zachowawczej, o wyraźnie społecznikowskim charakterze. W XIX w. i nieco później został umieszczony w wielu ówczesnych encyklopediach i słownikach. (...) Dużo uwagi poświęcają mu współcześni białoruscy badacze, głównie ze względu na jego bliskie kontakty z Sawiczem".

Даведнік „Мысліцелі і асветнікі Беларусі" так піша пра погляды Мацвея Лавіцкага: „Лавіцкі рашуча адвяргаў крывавыя пераваротыі рэвалюцыі тыпу якабінскай дыктатуры за іх жорсткі, антыгуманны характар, лічыў іх з'явай бяссэнсавай з пункту гледжання натуральнага парадку рэчаў. (...) Ён ставіў і імкнуўся знайсці адказ на пытанні: ці ёсць у Расіі сілы, якія могуць быць саюзнікамі прыгнечаных народаў у іх змаганні за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, ці можа сама Расія ў будучым стаць краінай, свабоднай ад прыгнёту і дэспатызму, і быць для іншых народаў не катам, а сябрам? (...) Ён верыў, што ў будучым настане шчаслівы век агульнага яднання людзей, калі будуць забытыя крывавыя сваркі паміж дзяржавамі і народамі, калі канчаткова спыняцца войны, калі збудуцца спадзяванні ўсіх народаў і ўсталююцца гуманістычныя ідэалы чалавецтва (...)".

У Студзеньскае паўстанне Лавіцкі не ангажаваўся. Пра гэта Шумскі так піша: „(...) cieszyło się ono jego sympatią, jednak na pewno nie uczestniczył w nim w sposób aktywny i widoczny. Z drugiej strony trzeba pamiętać, że wielu byłych „Sybiraków" traktowało powstanie jako przedsięwzięcie od początku skazane na niepowodzenie (...). Prace publicystyczne i literackie — jak się zdaje — całkowicie zarzucił. (...) Uzasadniając odmowę opracowania do Słownika Geograficznego Królestwa Polskiego hasła „Milejczyce", pisał że „w życiu dawnem i dzisiejszem tego lichego miasteczka było dość spraw takich, o których ja nie umiałbym powiedzieć prawdy bez ubliżenia prawdzie". Jest to wyraźna aluzja do ówczesnej cenzury, która całkowicie uniemożliwiała swobodne publiczne wypowiedzenie się. W tym konkretnym przypadku Łowicki zapewne miał na myśli likwidację po powstaniu styczniowym parafii rzymsko-katolickiej w Milejczycach i zamianę miejscowego kościoła na cerkiew prawosławną". Цэнзура, як своеасаблівае выяўленне волі правадыроў, прымусіла Лавіцкага скарыцца да летуценняў пра „гуманістычныя ідэалы чалавецтва".

Пара вярнуцца ў Ваські. Вось што пра гэтую вёску піша Шумскі: „Wieś Waśki — miejsce urodzenia i dzieciństwa Macieja Łowickiego — powstała na przełomie XVI i XVII w. jako drobna osada rybaków nad rzeką Krzywiec, dopływem Narwi, na obszarze Puszczy Ladzkiej, położonej w widłach Narwi i Narewki. (...) Według pomiaru z 1789 r. wieś obejmowała 20 włók miary chełmińsko-polskiej (ok. 360 ha) różnych użytków. W 1790 r. Waśki składały się z 9 dymów wiejskich, a w 1802 r. liczyły już 28 dymów (siedlisk). Według rejestru z 1838 r. we wsi mieszkały 32 osoby — głowy rodzin lub samotni — użytkownicy gruntów. Po III rozbiorze Waśki znalazły się w departamencie białostockim Prus Nowowschodnich i należały do państwowego klucza (amtu) Klejniki. Podległość amtowi klejnickiemu zachowana została również po utworzeniu w 1807 r. obwodu białostockiego w granicach Rosji. Plan z 1802 r. wskazuje, że zabudowa wiejska położona była na prawym brzegu rzeki Krzywiec. Wieś stanowiła wówczas typową ulicówkę.

Chłopi wsi Chrabostówka i Waśki podali w 1800 r. skargę do pruskiej Kamery Wojenno-Ekonomicznej w Białymstoku. Pisali, że w rezultacie nowego pomiaru w 1789 r. wydzielono im bardzo nieurodzajne grunty: „jedne z włók zupełnie nie powytrzebiane, pieńkami i chróstami zawalone, inne w pozycji błotnistej, gdzie ługi i bagna nieużyteczne (...), inne zaś lubo czyste, ale przez ziemię piaszczystą, żadnego albo mało gospodarzowi pożytku przynoszące". Narzekali także, że pozbawiono ich lasów, bowiem „gruntu kawał, który się mógł nazwać najlepszym waśkowskiego, do straży odebrane". Na gruncie odebranym wówczas wsi utworzono osadę strażnika leśnego. Osada ta znajdowała się w pobliskim uroczysku Borowisko.

Mieszkańcy wsi przed 1839 r. należeli do dwóch narewskich parafii: grecko-katolickiej (unickiej) i rzymsko-katolickiej. Trudno powiedzieć, który z tych kościołów liczył więcej we wsi wyznawców. Jeszcze w 1727 r. parafia unicka z Narwi nie obejmowała mieszkańców Wasiek. Wyznanie prawosławne nie może być brane pod uwagę, bowiem w XVIII i na początku XIX w. nieliczni jego wyznawcy skupiali się w pobliżu trzech istniejących wówczas klasztorów (Bielsk, Drohiczyn, Zabłudów)". Дык якая ж тады, да ўніі, парафія ахоплівала не надта адлеглыя ад Бельска Ваські? Пра гэта мой гістарычны правадыр неяк не здагадваецца... *(працяг будзе)*

Нараўчанская гміна

Больш дошак аб'яў

Зараз у вёскі ў Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) прывезлі новыя прыгожыя дошкі аб'яў. Яны з дашком ад дажджу. У другой палове мая дошкі аб'яў паставілі, між іншым, у Новым Ляўкове і Новінах. Новую дошку аб'яў прасіў у войта солтыс Новага Ляўкова падчас сесіі Гміннай рады.

У вёсачцы Новіны такой дошкі аб'яў раней увогуле не было і аб'явы прыбівалі на платах.

— А тут вось прыехалі з управы гміны ў Нараўцы і спыталіся ў нас, дзе мы хацелі б мець дошку аб'яў, — расказалі мне Мікалай і Багуслава Казлоўскія з Новін. — Жыхары дайшлі да вываду, што будзе найлепш, калі яна будзе пасярэдзіне вёскі. Так і атрымалася.

Новінцы хочуць, каб да іх прывозілі афішы, плакаты ды запрашэнні на фэсты і на ўсе культурна-забаўляльныя мерапрыемствы ў Нараўчанскай гміне ды і ў суседніх: Міхалоўскай, Нарваўскай ці Гайнаўскай. Яны былі недаінфармаваныя. Ім нічога не было вядома, калі адбудуцца сесіі Гміннай рады. А гэта не павінна быць засакрэчаным. Сюды не траплялі паведамленні мясцовых установ.

Жыхары Новін хочуць ведаць пра мерапрыемствы, якія ладзяць нараўчанскі Гмінны асяродак культуры і святліца ў Старым Ляўкове (а ў ёй шмат што арганізуюць) або таксама Гайнаўскі дом культуры і Свята-Троіцкі сабор у Гайнаўцы (тут у маі прайшлі Дні царкоўнай музыкі).

Солтыс Новага Ляўкова паехаў 20 мая да войта Мікалая Павільча і падзякаваў за новыя дошкі аб'яў. Выказаў свае і жыхароў салэцтваў задавальненне, што іх прапановы так хутка ажыццяўляюцца.

Дадам, што неўзабаве, дзякуючы дзейснаму падыходу войта Нараўчанскай гміны да пастулатаў солтыса, будуць паспяхова вырашаны дзве чарговыя важныя справы новаляўкоўцаў. І гэта цешыць!

Інвестыцыі ў Міхалове і Супраслі

Зараз у Міхалове ў пачатковай школе і гімназіі закончылі пабудову скейтпарка і служыць ён перш за ўсё моладзі, якая любіць катацца на скейтбордах. Кошт яго пабудовы склаў суму больш за 200 тысяч злотых. Палова гэтай сумы — еўрасаюзныя фінансавыя сродкі.

Пры тамашняй школе будуюць таксама крыты басейн. Восенню здадуць яго ў карыстанне. На гэтую інвестыцыю прызначылі 11 мільёнаў злотых. Але ад восені аматарам плавання не трэба будзе ездзіць у Беласток або ў Гайнаўку.

Яшчэ сёлета ў Міхалове адрамантуюць вуліцу Вузкую.

А што ў Супраслі? Сёлета пабудуюць новыя маставыя на вуліцах Хадакоўскага, Канарскага і Целічанскай ды будуць рамантаваць дарогу з Супраслі ў Целічанку.

Варта дадаць, што на рамонты дарог і вуліц павятовыя і гмінныя самаўрады атрымалі грошы ў рамках Нацыянальнай праграмы перабудовы мясцовых дарог.

Ян ЦЕЛУШЭЦКІ

Сёлета ў Міжнародным конкурсе дзіцячай і маладзёжнай песні „Ноты сяброўства", што 4 і 5 чэрвеня праходзіў у Гайнаўцы, прынялі ўдзел каля 60 выканаўцаў, а сярод іх салісты, дуэт і калектыў „Світанак" з Пружан (Беларусь). Гайнаўскае мерапрыемства здабыла прызнанне перш за ўсё на Беласточчыне. Сярод выканаўцаў, побач таленавітых гайнаўскіх дашкольнікаў і вучняў, можна было ўбачыць таксама ўдзельнікаў з Бельска-Падляшскага, якія вучацца там беларускай і ўкраінскай мовам, ці дзетак з Беластока, у некалькіх выпадках таксама навучэнцаў беларускай мовы. Конкурсная камісія толькі пацвердзіла меркаванні гледачоў, што мастацкі ўзровень выступленняў быў высокі як сярод маладых спевакоў з Польшчы, так і гасцей з Беларусі.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Ноты сяброўства

„Світанак" з Пружан

„Вянок" з бельскай „тройкі"

— Узровень выканання ў час конкурсу быў высокі і параўнальны да іншых гэтага роду конкурсаў у Польшчы, на якіх я пабывала з гайнаўскімі вучнямі. На вельмі прыстойным узроўні выступілі госці з Беларусі, якія, так як і ў мінулых гадах, займалі прызавыя месцы ў розных катэгорыях. Удала выступілі вучні з Беластока і Бельска-Падляшскага. Сёлета прыбылі да нас таксама вучні з Белай-Падляшскай, — сказала Марта Грэдаль-Іванюк з Гайнаўскага дома культуры — арганізатарка конкурсу.

Камісія асаблівую ўвагу звяртала на інтанацыю, дыкцыю, чысціню спеву і, канешне, на спосаб пераказу зместу песень і іх адчуванне вучнямі.

— Мы вельмі рады, што нашы салісты і дуэт занялі прызавыя месцы. Апошнім часам прыязджаем сюды штогод і за кожным разам вяртаемся дамоў з узнагародамі. Тут вельмі добрая атмасфера да выступаў і конкурснага спаборніцтва, — сказала метадыст Пружанскага аддзела культуры Галіна Махнач.

— Я вялікую ўвагу звяртала на сцэнічнае афармленне свайго выступлення. Загадзя я вучылася як весці сябе на сцэне, як звяртацца да публікі. У галоўным я хацела поўнасцю аддаць настрой песні. Дзеля гэтага вельмі важныя ўсмешкі, позіркі ў напрамку публікі, бо без гэтага песня не ажыве. Я дзеля перамогі ўклала ў песню сваю душу і ўдалося, я заняла першае месца ў сваёй катэгорыі, — цешылася маладзенькая Ксюша Пухнарэвіч з Пружан, якая заняла першае месца ў катэгорыі салістаў IV-VI класаў падставовай школы.

Разам з Кацяй Куксай з Пружан Ксюша заняла таксама першае месца ў катэгорыі вакальных калектываў (узрост да 12 гадоў). Вельмі вялікае ўражанне зрабіў на публіцы калектыў „Світанак", створаны на аснове Узорнага дзіцячага хору Пружанскай школы мастацтваў імя Рыгора Шырмы. Дзяўчаты ў прыгожых каляровых уборах выступілі з песняй „Ой, Купала" і запрэзентавалі карагод са спевам і танцамі. Хаця конкурсная камісія прызначыла пружанскім дзяўчатам другое месца, пахваліла іх за ўзорнае сцэнічнае афармленне ў час прэзентавання песні.

— У нашым калектыве выступіла восем асоб, а ва ўсім нашым хоры, што прэзентуецца толькі ў акдэмічнай манеры, выступае звыш дваццаці дзяўчат. Цяпер мы паспрабавалі выступіць у эстраднай манеры і я лічу, што другое месца, гэта добрае месца як на першы эстрадны выступ, — расказвала кіраўнік калектыву Ірына Буланькова.

— Сёлета была моцная канкурэнцыя і другое месца — зусім добры паказчык, — заявіла Яна Дыба са „Світанку". — Нам вельмі падабаецца атмасфера конкурсу і мы рады, што можам паглядзець як спяваюць іншыя.

Другое месца ў катэгорыі вакальных калектываў ва ўзросце ад 13 да 19 гадоў разам са „Світанкам" заняў калектыў „Вянок" з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім. Дзяўчаты з гэтага гурту, якімі апякуецца Іаанна Хількевіч, радаваліся прызавым месцам пасля абвяшчэння вынікаў конкурсу.

— Гайнаўскі конкурс вялікі і нам тут спадабалася. Мы рады, што ўдалося заняць другое месца сярод моцнай канкурэнцыі, — сказалі бельскія белгімназісткі.

Аднак самую вялікую колькасць пераможных месц занялі гаспадары мерапрыемства — дзеткі і моладзь са Студыі песні Гайнаўскага дома культуры, якімі апякуецца Марта Грэдаль-Іванюк. Дарэчы, яна сама ў школьным узросце выступала сола і з белліцэйскім калектывам „Знічка" і дабівалася многіх перамог у шматлікіх конкурсах.

— Я разлічвала недзе на трэцяе месца, а тут нечакана, выступаючы сола, заняла першае месца і разам з калектывам Студыі песні ГДК таксама апынулася на першым месцы, — расказвала гайнаўская белгімназістка Юліта Ваўрашук. — Песню я сама падабрала, звяртаючы ўвагу на мае вакальныя магчымасці, але вялікая заслуга ў маёй перамозе нашага апекуна Марты Грэдаль-Іванюк.

— Мне падабаецца конкурс, але я не заняла пераможнага месца, выступаючы сола. Аднак гэта кампенсуе першае месца, якое здабыў вакальны калектыў Студыі песні ГДК, з якім я выступала, — сказала іншая гайнаўская белгімназістка Марлена Бяглюк, якая перш за ўсё выступае са „Знічкай".

— Марлена Бяглюк спявае вельмі добра, але на гэты раз ёй не атрымалася. Я падабрала ёй песню, якая Марлене не падабалася і можа гэта было прычынай менш удалага выступу. А ў Юліты Ваўрашук апошнім часам у спяванні наглядаецца вялікі прагрэс, таму і перамагла, — сказала інструктар Студыі песні Марта Грэдаль-Іванюк.

Калі на сцэне амфітэатра выступалі конкурсныя пераможцы, побач Белавежскі нацыянальны парк наладзіў дзеткам адукацыйныя гульні. Маладыя людзі знаёміліся з біялагічнай разнароднасцю Белавежскай пушчы, прымалі ўдзел у адукацыйных конкурсах і малявалі тое, што ім у пушчы спадабалася.

У катэгорыі дашкольнікаў і найменшых вучняў першае месца занялі Дарота Штылер і Кася Дружба са Студыі песні ГДК, другое месца — Ева Іванюк з ГДК, а трэцяе месца — Адам Зіневіч з Прадшколля № 5 у Гайнаўцы. Сярод салістаў з IV-VI класаў, апрача згаданых раней, другое месца заняла Каця Кукса з Пружанскага цэнтра культуры, а трэцяе месца — Зузя Твардоўская з Мастацкага цэнтра Элізы Сахарчук з Беластока. Сярод калектываў (узрост да 12 гадоў) першае раўнапраўнае месца заняло „Малое ГДК" са Студыі песні ГДК, другое месца — Дар'я Якімчук і Ізабела Растоўская з Комплексу школ імя Адама Міцкевіча ў Бельску-Падляшскім. З ліку салістаў гімназічнага ўзросту ўсе пераможныя месцы занялі вучні са Студыі песні ГДК: раўнапраўнае першае — Паўліна Нікалаюк, другое — Марта Іванюк і трэцяе Матэвуш Харкевіч. Сярод салістаў са звышгімназічных школ таксама пераможцамі сталі толькі гайнавяне. Першыя месцы занялі гайнаўская белліцэістка са Студыі песні ГДК Рэната Тушынская (спявае таксама ў „Знічцы") і Агнешка Ежык з Гайнаўкі, а другое месца — Марта Адамюк са Студыі песні (таксама са „Знічкі"). Пра пераможцаў сярод калектываў (узрост ад 13 да 19 гадоў) пісаў я раней, а сярод асоб з абмежаваннямі першае месца заняў калектыў „Бонга" з Дома сацыяльнай дапамогі ў Беластоку, другое месца — вакальны калектыў Цэнтра працоўнай тэрапіі ў Гайнаўцы, а трэцяе — Юліта Кічкайла з гэтага ж цэнтра.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Мілаш сугучны беларускаму свету



Калі Лявона Баршчэўскага назвалі першым перакладчыкам Чэслава Мілаша на беларускую мову, ён адразу запярэчыў:

— Мала хто ў нас памятае, што Мілаша першы перакладаў Максім Танк, яшчэ ў гады, калі польскі паэт не падаўся ў эміграцыю на Захад.

Лявон Баршчэўскі, госць Беларускага чацвярга, перакладчык між іншым „Маральнага трактата" і „Паэтычнага трактата", сутыкнуўся з творамі Мілаша ўжо ў пачатку васьмідзесятых, калі пісаў доктарскую дысертацыю і меў доступ да спецфондаў у Маскве. Тады ўручную перапісаў (нелегальна) сорак вершаў у свой сшытак і прывёз іх у Беларусь. Пасля паспрабаваў іх перакласці на беларускую мову. З гатовай падборкай паехаў да паэта Алега Мінкіна, які ў той час жыў у Бярэсці. Мінкін ацаніў усю спробу адным словам: кепска!

— Мае першыя спробы не былі ўдалыя, — прызнаецца Лявон Баршчэўскі, перакладчык, які ведае 17 моў. — Я тады яшчэ не быў для гэтага гатовы. Бо добры пераклад гэта не толькі моўная справа. Каб твор не патраціў сэнс, трэба перакадзіраваць адну сістэму ў другую. Ды наогул ці можна навучыцца мастацтву перакладу? Гэта сумніўная справа. Мастацтва перакладу патрабуе натхнення і тонкага адчування літаратуры. Ніякія заняткі ва ўніверсітэце такому не вучаць.

Нягледзячы на складаны пачатак, Лявон Баршчэўскі не згубіў цікавасці да перакладаў Чэслава Мілаша. Вялікі ўплыў пакінула публіцыстыка лаўрэата Нобелеўскай прэміі. У 2006 годзе, калі Калегія Усходняй Еўропы прапанавала беларускаму літаратурнаму асяроддзю польска-беларускае выданне Мілаша, Лявон Баршчэўскі, разам з іншымі аўтарамі (між іншым Хадановічам, Чобатам, Чыквіным, Бушляковым) узяўся нанава перакладаць аўтара „Даліны Ісы". Чаму беларусы маюць асаблівы інтарэс, каб прамаваць творчасць польскага пісьменніка?

— Калі ўзяць „Маральны трактат" дык, нягледзячы на час, ён сугучны беларускай рэчаіснасці. У нас, калі ў 2005 годзе ўзнік прыўладны Саюз пісьменнікаў, у літаратурным асяроддзі адбыўся раскол. Ён сцелецца змрочным ценем па наш дзень. Вось калі пасля 19 снежня 2010 года быў арыштаваны Уладзімір Някляеў, некаторыя пісьменнікі, як Арлоў, Барадулін, пайшлі ў суд бараніць калегу-паэта. І, хаця здавалася б, што ў справе Някляева не павінна быць сумненняў у яго невіноўнасці, некаторыя пісьменнікі з прыўладнага саюза не падтрымалі іх. Мы на ўласнай скуры зразумелі, што тое XIX-вечнае перакананне, калі паэтам вызначалася асаблівае месца — *паэты сумленне народа* — страціла сэнс.

Лявон Баршчэўскі адзначыў выключны энтузіязм і працу ў карысць прамоцыі Чэслава Мілаша ў Беларусі. Цягам юбілейнага 2011 года выйдзе з друку чатыры тамы з яго паэзіяй, прозай і літаратурнай публіцыстыкай.

— Да гэтай пары ніхто з замежных аўтараў у такім аб'ёме не выходзіў, — адзначыў госць чацвярга.

Выданні пабачаць не толькі жыхары Мінска. Іх прэзентацыя прадугледжана ў найбольшых гарадах РБ.

Беларускі, перадапошні ў гэтым акадэмічным годзе, чацвер з Лявонам Баршчэўскім (26 мая г.г.) завяршыўся гутаркай пра складанасці і праблемы беларускага перакладчыка. Далёка не ўсе творы сусветнай класікі перакладзены на беларускую мову і калі яны выступаюць у перакладаным тэксце, іх трэба дадаткова агучыць на беларускую мову. Праўда, не ўсе перакладчыкі бачаць такую патрэбу і той фрагмент ставяць паруску. Такая кветка родам са „Скутага розуму" — так менавіта гучыць беларускі загаловак славутага шэдэўра „Zniewolony umysł" Чэслава Мілаша.

Пасведчанне аб смерці Антона Луцкевіча

Гэтымі днямі Маргарыта Пярова, унучатая пляменніца старшыні Рады Міністраў і міністра замежных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі Антона Луцкевіча, атрымала з аддзела запісу актаў грамадзянскага стану па г. Аткарску і Аткарскім раёне Саратаўскай вобласці пасведчанне аб смерці свайго знакамітага родзіча.

У свой час у часопісе „ARCHE" былі надрукаваныя дакументы аб смерці Антона Луцкевіча на перасыльным пункце ў г. Аткарск, а ў кнізе яго твораў „Барацьба за вызваленне" (2009) — фотакопіі рапарта начальніка санітарнай часткі начальніку Аткарскага перасыльнага пункта аб смерці А. Луцкевіча і акта аб яго пахаванні. Аднак у некаторых даведніках да гэтага часу пішуць, што А. Луцкевіч памёр „каля 1946 г.".

З дакумента, атрыманага Маргарытай Пяровай, вынікае, што запіс акта аб смерці Антона Луцкевіча за нумарам 390 учынены яшчэ 30 лістапада 1943 года. Гэты дакумент яшчэ раз сведчыць, што сынам Антона Луцкевіча (абодва ўжо не жывуць) у адпаведнасці з тагачаснымі інструкцыямі было выдадзена фальшывае пасведчанне аб смерці іх бацькі.

Трэба спадзявацца, што цяпер у даведачнай літаратуры і ў электронным каталогу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў прыватнасці будуць паведамляць праўдзівую дату смерці — 23.03.1942 г. — аўтара акта 25 Сакавіка.

Анатоль СІДАРЭВІЧ

Пётр БАЙКО

Крашэўскі з-пад пушчы

На зломе XIX і XX стагоддзяў у Белавежскай пушчы гасцявалі вядомыя літаратары, сярод іх Эліза Ажэшка, Генрык Сянкевіч, Вацлаў Серашэўскі. На звесткі пра іх знаходжанне тут можам наткнуцца, гартаючы розныя выданні, прысвечаныя нашай лясной жамчужыне. Наогул не знаходзім у іх прозвішча Юзафа Ігнацы Крашэўскага — выдатнага польскага белетрыста, паэта, гісторыка, літаратурнага крытыка, публіцыста і выдаўца, якога сувязі з пушчай былі больш цеснымі, чымся ў выпадку згаданых людзей пяра — ён праз нейкі час жыў паблізу яе. Шкада толькі, што Крашэўскі не прысвяціў пушчы аніводнага твора, як зрабілі гэта вышэйзгаданыя літаратары. Пры яго пісьменніцкім таленце напэўна атрымаўся б шэдэўр.

Юзаф Ігнацы Крашэўскі

Фальварак Доўгае. Гравюра з 1880 г.

Бацькі Ю. І. Крашэўскага, Ян і Зофія з д. Мальская, жылі на Гарадзеншчыне, каля Пружаны, у маёнтку Доўгае (Dołhe), які размяшчаўся ў адлегласці больш-менш 20 км ад усходняй сцяны Белавежскай пушчы. Фальварак Крашэўскіх быў заснаваны ў XIX стагоддзі і праіснаваў да 1939 года. Будучы пісьменнік нарадзіўся аднак у Варшаве, куды яго маці схавалася ў боязі перад французска-расійскай вайной, а выхоўваўся ў Раманове, што ў Влодаўскім павеце (зараз — Бела-Падляшскім) пад апекай бабкі і прабабкі.

Аўтар „Старой казкі" ўпершыню сутыкнуўся з Белавежскай пушчай восенню 1827 года, калі, будучы 15-гадовым юнаком, праязджаў праз яе, едучы з боку Брэста ў Свіслач, дзе меў скончыць гімназічную навуку (пасля навукі ў Белай-Падляшскай і Любліне). У Свіслацкай гімназіі, заснаванай у 1805 годзе графам Вінцэнты Тышкевічам, знаходзіўся да лета 1829 года. Тут атрымаў атэстат сталасці. Потым выехаў у Вільню, дзе паступіў на літаратурнае аддзяленне тамашняга ўніверсітэта.

Варта ўспомніць, што рашэнне прысвяціць сябе літаратурнай працы Ю. І. Крашэўскі прыняў менавіта падчас знаходжання ў Свіслачы. Вялікі ўплыў на гэта меў гімназічны настаўнік Валіцкі, які потым стаў прататыпам настаўніка ў „Рамане без загалоўка" (1855).

Пасля вызвалення ў ліпені 1833 года з-пад паліцэйскага нагляду і атрымання дазволу на выезд з Вільні, Ю. І. Крашэўскі на некалькі гадоў пасяліўся ў родным сяле Доўгае, дзе пад наглядам бацькі азнаямляўся з працай на гаспадарцы. У 1838 годзе ажаніўся з Зофіяй Варанічанкай і ў гэтым жа годзе выехаў з жонкай на Валынь.

Аб Белавежскай пушчы Ю. І. Крашэўскі ўспамінае ў „Карцінках з жыцця і падарожжа" (1842): „Шмат разоў перасякаў Белавежскую пушчу (…), якой маляўнічыя дрэвы стаяць яшчэ перад маімі вачыма. Не ведаю ці ў цэлай Еўропе знаходзіца дзесьці лес гэтак першабытнай эпохі". Вельмі праўдападобна, што прыгожае апісанне лесу, якое знаходзім у „Старой казцы" (1876) мае свой прататып у Белавежскай пушчы.

Варта нагадаць і тое, што Ю. І. Крашэўскі сябраваў з Дзмітрыем Далматавым — ляснічым Гродзенскай губерні, які часта наведваў Белавежскую пушчу, выконваў у ёй розныя працы і захапляўся яе прыгажосцю.

У будучым годзе выпадае 200 гадавіна з дня нараджэння славутага пісьменніка. Ю. І. Крашэўскі нарадзіўся 28 ліпеня 1812 года, а памёр 19 сакавіка 1887 года ў Жэневе.

Беласток

Усё больш кветак у горадзе

Прыйшла вясна і ў Беластоку ўсё больш кветак. Першыя кветкі — жоўтыя шафраны ўжо перацвілі, між іншым, на плошчы Люсы. Цяпер тут зрок цешаць рознакаляровыя браткі.

У першай палове мая браткі пасадзілі ў кветніцах у цэнтры горада, на плошчы Яна Паўла II і кс. Міхала Сапоцькі ды ў парках, м.інш. на Плянтах, на скверыку Арміі Краёвай, на скрыжаванні вуліц Браніцкага і Міцкевіча ды на алеі Пілсудскага з кругавой развязкай.

Не падвялі шафраны і пасаджаныя ў верасні мінулага года цюльпаны. Сёлета на плошчах зацвілі яны ўпершыню. Найбольш іх на плошчы Незалежнасці імя Дмоўскага ў парку Канстытуцыі 3 Мая і на скверыку па вул. Аўгустоўскай (яна спалучана з вул. Міцкевіча). Летам зацвіце яшчэ больш кветак — ужо летніх.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

ЗОРКА
для дзяцей і моладзі

Развіталіся і выпусцілі ў свет

У жыцці кожнага дзіцяці і дарослага чалавека ёсць важны момант. Момант, калі адчуваем здзяйсненне. Тады без лішніх пахвал і ўзнагарод мы адчуваем радасць. Яна плыве з нашых сэрц і напаўняе паветра. Людзі глядзяць на цябе з добрай усмешкай і ўсё навокал здаецца прыгажэйшым...

Канец школьнага навучальнага года — час падвядзення вынікаў. У Беластоку кожны год адзначаюць гэты момант. Пачынаецца ўсё з малебна, на які прыходзяць дзеці, бацькі і настаўнікі. Пасля бацькоў запрашаюць на мастацкія прэзентацыі. Для школьнікаў як штогод будуць узнагароды і граматы...

У гэты раз свята доўжылася аж тры дні. Дзень да галоўнага мерапрыемства ў ПШ № 4 адбылася сустрэча з пісьменнікамі Леанідам Дранько-Майсюком і Эдуардам Акуліным. Адвячоркам, 3 чэрвеня г.г., бацькі і дзеткі, настаўнікі і госці сустрэліся ў кавярні „Фама". Уся ўрачыстасць пачалася вершам Уладзіміра Някляева „На вуліцы Царкоўнай пасяліцца". Верш прачытала Наталля Кандрацюк-Свярубская, якая разам з Алесем Мазуруком вялі мерапрыемства.

Выступаюць маймалодшыя

Добрае свята не можа цягнуцца ад рання да вечара. Нават найпрыгажэйшыя рэчы трэба паказаць у меру, каб яны не пераелiся і не стамлялі. Пра гэта падумалі арганізатары сустрэчы — сябры Згуртавання АБ-БА. І вось першымі на сцэну выйшлі наймалодшыя. Яны праспявалі нізку дзіцячых песень, якіх навучыла іх Ала Каменская. Пасля запрэзентаваліся вучні малодшых класаў са спектаклем „Вучыся, вучыся, вучыся". Пастаноўка на словы Віктара Шведа проста захапіла бацькоў. Кожная сцэна, якая завяршалася інтэлігентным гумарам, была „ўзнагароджаная" здаровым смехам. У канцы выйшлі дзеці і моладзь з „Цацачнай крамай". Гэты спектакль, у стылі кабарэ, проста захапіў дарослых і малых музыкай, сцэнічным афармленнем, ігрой акцёраў ды эфектоўным дымком.

— Я глядзеў на гэты спектакль і думаў: ці ён яшчэ мой, ці ён ужо ваш? — прызнаўся Леанід Дранько-Майсюк, аўтар вершаў, на якіх аснове збудаваны спектакль.

Здаецца, няма большых слоў прызнання як надзяліць свой твор самастойным, ужо дарослым жыццём. Падобныя думкі перажывалі бацькі і настаўнікі, якія выпускалі сваіх дзяцей і выхаванцаў у свет. Вось і сёлета мы развіталіся з пяцюю выпускнікамі ліцэя, якія на дарогу атрымалі беларускія выданні, між іншым „Моц смаку" Юры Качука і падборку літаратурных шэдэўраў Сыса, Алексіевіч, Быкава...

Кніжныя ўзнагароды і граматы атрымалі таксама выпускнікі гімназіі № 7. Гэтая прыгожая і таленавітая кампанія будзе прадаўжаць беларускую адукацыю ў трэцім беластоцкім ліцэі. Час развітання прыйшоў таксама для вучняў ПШ № 4. Яны атрымалі на дарогу рукзакі і граматы. Узнагароды спансаравалі Маршалкоўская ўправа, Радыё Рацыя і Віктар Швед, які падпісаў кожнаму том паэзіі „Адплываем з Мора".

Непаўторнай і важнай для асяроддзя была прысутнасць аўтараў слоў спектакляў Леаніда Дранько-Майсюка і Віктара Шведа. Іх пасадзілі ў ганаровым першым радзе і пры людзях падзякавалі за пісьменніцкі дар.

— Мы паказалі толькі некаторыя спектаклі, — гаварыла настаўніца Аліна Ваўранюк, пастаноўшчык і апякун амаль усіх мастацкіх праектаў, якія робіць АБ-БА. — Бо таго ўсяго, што робім, немагчыма паказаць у час адной прэзентацыі...

Тут трэба назваць спектакль „Ой даўно-даўно", з якім нашыя сябры аб'ехалі ўжо палову Беласточчыны. Словам, пасля доўгіх гадоў працы прыйшло творчае здзяйсненне, якое прыносіць радасць самім акцёрам, іх бацькам і цэламу асяроддзю. І самае галоўнае: дзеці і моладзь — усе добрыя вучні і ветлівыя сябры.

ЗОРКА
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Вучыся, вучыся, вучыся"

„Цацачная крама" з апякункай акцёраў Алінай Ваўранюк

Муха-пяюха

Беларуская народная казка

Жыла-была муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць камароў. Запрэгла муха-пяюха камароў у каляску ды паехала на пагулянку. Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як паню званць-велічаць?

— Я муха-пяюха. А ты хто?

— А я па паліцах скрабатуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — скача жабка:

— Добры дзень, панове! Як вас званць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. А ты хто?

— А я па сажалках рагатуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць яны шырокаю — на галінцы вавёрка:

— Добры дзень, панове! Як вас званць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. А ты хто?

— А я па елках скакуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць заяц:

— Добры дзень, панове! Як вас званць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. А ты хто?

— А я праз дарогу скок.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — ідзе воўк:

— Добры дзень, панове! Як вас званць-велічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. Праз дарогу скок. А ты хто?

— А я галодны воўк. Усіх вас паем.

Пачулі гэта камары, падняліся ўгору і паляцелі разам з каляскай. А галодны воўк паляскаў зубамі і пайшоў далей ні з чым.

(З народнага календара)

Русальны тыдзень

12-19 чэрвеня, *Русальны тыдзень.* Цягам цэлага тыдня забаранялася сеяць і садзіць, быццам усё пасеянае ў гэты перыяд будзе малое і крывое. Нашы продкі верылі ў русалак. Гэта душы няхрышчаных істот і тапельцаў, якія ў гэты тыдзень пануюць на зямлі. Русалкі хаваюцца ў лесе ці балоце або выходзяць апоўначы на бераг ракі, каб гушкацца на галінах дрэў. Злавіўшы чалавека, могуць заказытаць яго да смерці. З гэтай прычыны забаранялася на гэтым тыдні купацца і хадзіць у лес. Каб задобрыць русалак, людзі праводзілі розныя святкаванні. На Гомельшчыне дзяўчаты выбіралі сярод сябе „русалку" і пад вечар з песнямі ішлі за вёску. Там разам з хлопцамі раскладалі вогнішча, у якое скідвалі з галоваў вянкі і разбягаліся ад страху, што іх заказычуць русалкі!

На Падляшшы тры дні пасля Сёмухі адзначаюць Градавую сераду. У гэты дзень у некаторых парафіях (напрыклад, у Старым Ляўкове) ідуць на могілкі памаліцца за душы памерлых. У Градавую сераду строга забараняецца працаваць у полі, інакш увесь плён паб'е град. Таксама жывыя ў нас павер'і пра русалак. Яшчэ ў часы майго дзяцінства дзяцей перасцерагалі, каб не таптаць жыта і травы: *Бо русалка хопіць за валасы і заказыча да смерці!*

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Трускалачныя палі назаўсёды

Вандроўку па класічных аўтарах у „Музыцы з кайфам" прыпынім цяпер зусім нечакана. Бо ці ж можна адмовіць звання класікаў музыкам гурту „The Beatles"?

„The Rolling Stones" існуюць амаль 50 гадоў! „Deep Purple" сваю гісторыю ствараюць ужо 43 гады. „The Beatles" існавалі няпоўных дзесяць гадоў (1960-1970), а запісаліся ў гісторыі як гурт, які прадаў найбольш альбомаў. „Бітлманія" — гэта калектыўная істэрыя, якая мае свой працяг да сёння. Тысячы людзей надалей сваю „музычную адукацыю" пачынаюць на „Бітлзах", а ў дзесятках месц на свеце адзначаюцца ўсялякія гадавіны, звязаныя з гісторыяй „Чацвёркі з Ліверпуля". Беларусь не адарваная ў гэтым сэнсе ад рэшты свету.

„Ob-la ki, ob-la-ka" — гэта назва фэсту, які ладзяць любіцелі творчасці „Бітлзаў" у Віцебску. Звяртаецца ён да славутай песні гурту, запісанай у 1968 годзе, арыгінальны загаловак якой „Ob-La-Di, Ob-La-Da". Фэст у гэтым годзе праходзіць 17-18 чэрвеня. Дата таксама невыпадковая — якраз 18 чэрвеня дзень народзін адзначае адзін з лідараў гурту Пол Макартні (другі лідар Джон Ленан быў застрэлены неўраўнаважаным фанатам перад сваёй хатай 8 снежня 1980 года). Мяркуецца, што „Ob-La-Di, Ob-La-Da" напісаў Макартні, таму беларускае шоў змяшчае травестацыю назвы і прымеркаванае яно менавіта да дня нараджэння аўтара, хаця некаторыя аўтарства песні прыпісваюць абодвум лідарам. Гісторыя беларускіх сустрэч з гуртом „The Beatles" сапраўды доўгая, бо фанаты гурту сустракаліся яшчэ ў Савецкім Саюзе, выхоўваліся на іх музыцы, як і рэшта свету. Сёння гэтыя спатканні набіраюць формы фэсту, які карыстаецца такімі здабыткамі сучаснай культуры як перформанс, флэшмоб ці велапрабег. Няйначай будзе ў бліжэйшых днях. 17-18 чэрвеня апрача вялікага канцэрта будзе можна ў Віцебску пазнаёміцца з фільмавай творчасцю на тэму „The Beatles" ці зразумець, што для іх творчасці абазначала студыя запісу „Abbey Road". А ці вы ведаеце? Ці слухаеце? А можа вы ўжо нават у адным са шматлікіх фан-клубаў? Я затое ў трускалачным сезоне прапаную паслухаць „Strawberry fields forever". Можа гэтым шляхам нехта пачне сваю прыгоду з „Бітлзамі"...

i_basovka@o2.pl

— Хто так круціць гуля-гоп, як Дагмара Янушкевіч з гэтага гурта? — пыталіся гледачы ў Беластоку, гледзячы на абраднае выступленне вучняў з Пачатковай школы ў Гарадку.

— Я вучуся ў другім „а" класе, — кажа ціхая, нясмелая залатавалосая дзяўчынка. — Беларускую мову вывучаю з першага класа. У нашым класе дзевяцёра вучняў вывучае беларускую мову, а ўсіх вучняў у класе — трынаццаць. Наша настаўніца гэта Тамара Бялькевіч. Вывучаем беларускія літары, пасля вершы. Мая бабуля Данка таксама ведае беларускія народныя вершы, такія як пра бусла-клекатуна. Мая мама таксама, калі я рыхтавалася да выступленняў, вывучыла на памяць мае вершы! А наша п'еса — беларуская, паказваем традыцыю.

— А ці ты сама пісала вершы па-беларуску?

— Яшчэ пакуль не прабавала. Мне больш падабаецца дэкламаваць вершы. Падабаюцца мне вершы пра звяроў. Люблю слухаць песні па радыё, а найбольш пра коціка, які захварэў — моцна яго шкадую. Люблю музыку, хаджу на навуку сучаснага танца ў доме культуры, два разы ў тыдні, маем такі гурт „Браво Гарадок!". Неўзабаве паедзем на майстар-класы ў Гонёндз. Будзем выступаць на Днях Гарадка, запрашаем!

(лук)

Дагмара ЯНУШКЕВІЧ

Фігуркі

У агародчыку
ў бабулі Данкі вясёла:
Стаяць там побач
вавёрачка з савою.
Глядзяць, як дзеці
з кніжкамі ідуць у школу,
Ды вавёрка шышкі ў
кошычку нясе з сабою.

Польска-беларуская крыжаванка № 25

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 21:

Карунка, Аня, саха, Ас, склон, жарабятка, забава, ом, раса, ткач, явар, карона, гук, пароль. Край, стог, жарт, сабака, краса, лавачка, асоба, ар, Аня, пяро, ах, вол, на, корань, Тамара.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Давід Баршчэўскі, Марта Лемеш, Лукаш Сідарук** з Орлі. Віншуем!



Гродзенскія студэнты сустрэліся з Мірай Лукшай

У рамках абмену студэнтамі па між Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам у Беластоку на працягу 16-21 мая гасцямі беларускай філалогіі былі студэнты-беларусісты з Гродна. Супрацоўнікі Кафедры беларускай філалогіі падрыхтавалі ім цікавую праграму. У аўторак сустрэліся найперш з прафесар Галінай Твараповіч, якая распавяла ім аб Літаратурным аб'яднанні „Белавежа". Потым нашы госці прынялі ўдзел у Фестывалі навукі і мастацтва. У прыватнасці студэнты Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі наладзілі сустрэчу з паэтам Янам Чыквіным. Хто хацеў, мог атрымаць кніжку з аўтографам аўтара. У сераду студэнты наведалі БГКТ і Культурны цэнтр Беларусі. У Цэнтры адбылася прэзентацыя кніг 5 „белавежанак": вядомых ужо паэтак Галіны Твараповіч і Жэні Мартынюк, а таксама трох дэбютантак — Юстыны Каролька, Лідзіі Маліноўскай і Кацярыны Сянкевіч. У чацвер студэнты пабывалі ў рэдакцыі газеты „Нівы", дзе іх гасцінна прывітаў намеснік рэдактара Віталь Луба. Арганічным працягам наведвання „Ніва" стала сустрэча з яе журналісткай, паэткай, пісьменніцай у адным — Мірай Лукшай.

Хочацца падкрэсліць, што сустрэча з М. Лукшай была найбольш чаканай некаторымі студэнтамі, таму што яны выбралі яе творчасць для заліку заняткаў па беларускай літаратуры Польшчы. Яны, як мне сказалі, хацелі пазнаёміцца з пісьменніцай асабіста. На пачатку доктар Анна Саковіч коратка ахарактарызавала творчасць М. Лукшы. Узгадала, што Міра Лукша дэбютавала як паэтэса ў газеце „Ніва" ў 1973 годзе. Выйшла 9 кніг пісьменніцы: паэзіі — „Замова" (1993), „Ёсць" (1994), „Wiersze tutejsze" (2003), „Жывінкі з глыбінкі" (2009) і прозы — „Дзікі птах верабей" (1992), „Выспа" (1994), „Бабскія гісторыі" (2001), „Дзяўчынка і хмарка" (2006), „Гісторыі з белага свету" (2008). Потым на сустрэчы распачалося найцікавае: голас узяла сама аўтарка. Яна займальна расказвала пра свае творчыя крыніцы, паэтычны дэбют і коратка спынілася на сваіх кнігах. Пісьменніца прачытала некалькі апавяданняў і вершаў, пазнаёміла з Эму з Эльяшук і Вавёркай з Нью-Йорка, героямі сваіх вершаў са зборніка „Жывінкі з глыбінкі". У студэнтаў былі шматлікія пытанні да Міры Лукшы як журналісткі. Яна расказала ім пра гэтую цяжкую, цікавую работу. Напрыканцы паэтка запрэзентавала некалькі вершаў з яшчэ не выдадзенага зборніка. Кожнага студэнта Міра абдарыла сваімі кнігамі, якія ўзбагацяць бібліятэчкі беларусаў з Гродна.

Далейшага творчага і жыццёвага плёну, дарагая „белавежанка"!

Віялета НІКІЦЮК-ПЭРКОЎСКАЯ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

ДРАНЬКО-МАЙСЮК І АКУЛІН У БЕЛАСТОКУ

Злева: Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк

На запрашэнне клуба Згуртавання бацькоў і дзяцей вывчучаючых беларускую мову „АБ-БА" прыбылі на сустрэчы на Беласточчыну намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, галоўны рэдактар выдання „Верасень" паэт і бард Эдуард Акулін і паэт, празаік, эсэіст і перакладчык Леанід Дранько-Майсюк. Сустрэліся яны таксама, між іншым, з вучнямі ў Бельску-Падляшскім.

— Абодва звязаны яны таксама з музыкай — Леанід як аўтар слоў шматлікіх песень, Эдуард сам спявае, — прадстаўляў мастакоў слова вядучы сустрэчу Мікола Ваўранюк, аўтар фільма пра Леаніда Дранько-Майсюка „Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка" (ён і аўтар „Цацачнай крамы"). Другая змена нашых вучняў рыхтуе гэтую п'есу на сцэну ў Беластоку, ужо пад музыку Анны Бабік.

У абодвух аўтараў багаты вопыт сустрэч з чытачамі, таксама з настаўнікамі і вучнямі школ. Нагоды сустрэцца з імі ў Беларусі даволі частыя, дзякуючы таксама актыўнасці саміх літаратараў.

— Цягам апошніх трох гадоў такіх сустрэч у маім творчым лёсе больш за трыста, — адзначыў Эдуард Акулін. — Такія сустрэчы неабходныя. На мінулым тыдні разам з Леанідам мы наведалі дзве літаратурныя мясціны: радзіму Якуба Коласа (выступалі ў Мікалаеўшчыне), і радзінныя мясціны Адама Міцкевіча: выступалі на Навагрудчыне ў Любчанскай сярэдняй школе і ў школе ў Вялікіх Вераб'евічах. Часам падчас такіх сустрэч мы адчуваем сябе сапраўднымі літаратурнымі Калумбамі: бо нас, жывых паэтаў, у такіх аддаленых мясцінах ніколі не бачылі.

Леанід Дранько-Майсюк, які нарадзіўся ў 1957 г. у Давыд-Гарадку Столінскага раёна Берасцейскай вобласці, выпускнік аддзялення паэзіі Літаратурнага інстытута ў Маскве, першыя вершы надрукаваў у столінскай раённай газеце „Навіны Палесся":

— Нашы сустрэчы са школьнікамі вельмі патрэбныя, таму што трапляем у такія месцы, дзе даўно ці зусім не бачылі „жывога" паэта, прытым выступаючага па-беларуску. Бывае, што выступаем у гэтых школах неаднойчы. Калі выступаю, я заўсёды называю тыя кнігі, якія на мяне ўплываюць. Мне хочацца, каб гэтыя кнігі былі прачытаны школьнікамі, гімназістамі, бо беларускі пісьменнік сёння павінен быць не толькі творцам, ён павінен не толькі складаць вершы альбо пісаць прозу — ён павінен быць прапагандыстам, ён павінен быць таленавітым рэкламным агентам. Калі ты прыязджаеш у тую ці іншую вёску, там у гэтай вёсцы ніколі не выступалі беларускія літаратары, то ты не толькі павінен расказаць пра сваю творчасць і прачытаць свае вершы, а прыкладна за пяць хвілін зрабіць такую дынамічную, змястоўную і разам з тым вясёлую лекцыю пра стан сучаснай літаратуры, каб людзі ведалі, што беларуская літаратура ёсць, што яна выдатная, што яна створана на выдатнай беларускай мове.

На пытанне пра забарону ці іншыя перашкоды ў арганізацыі выступленняў ці іх правядзенні, аўтары адказалі, што пра гэта яны не думаюць і ўпарта праводзяць свае сустрэчы ў тым ці іншым месцы ў Беларусі, і запросін на спатканні многа, бо чакаюць іх чытачы.

Эдуард Акулін гэта не толькі аўтар сямі паэтычных кніг, бард, перадкладчык з шэрагу славянскіх моў, але і галоўны рэдактар новага часопіса „Верасень".

— Часопіс „Верасень" гэта новае літаратурна-мастацкае выданне для моладзі. Яно было заснавана па ініцыятыве Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, каб падтрымаць маладую літаратуру (2009 г.). Я бачу ў гэтым слове найперш слова „вера". Сярод аўтараў і знакамітыя літаратары, і моладзь. У кожным нумары стараемся друкаваць і літаратурных мэтраў, бо ў маладосці варта браць урокі майстэрства ў сталасці. У першым нумары прадстаўлены маладыя творцы Віталь Рыжкоў, Наста Кудасава, Настася Кухарэнка, Воля Чайкоўская, Ігар Кананоўіч, Лізавета Дамініка Панамарова, Дар'я Ліс, Алена Беланожка, а побач — жывыя класікі: Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дранько-Майсюк. Далей — Леанід Дайнека, Барыс Пятровіч Сачанка, Ніл Гілевіч, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў... Перыядычнасць выхаду часопіса „Верасень" — два разы ў год. Марым аб выхадзе раз на два месцы, паколькі матэрыялаў хапае. Не зашкодзіла б бібліятэчка „Верасня". Думаем пра правядзенне разнастайных літаратурных конкурсаў, фестываляў паэзіі, творчых семінараў з майстар-класамі. У першым нумары мы запрапанавалі паэтычны конкурс на лепшы патрыятычны і лірычны верш. Ужо ў першым нумары ёсць старонка „Верасок" — для самых юных творцаў, школьнікаў. Свае творы можна дасылаць па электронным адрасе *verasenchas@gmail.com*. Выйшлі тры нумары і ў гэтых нумарах мы паспелі надрукаваць каля 90 малых аўтараў.

„Верасень" параўноўваюць з незалежніцкім літаратурным часопісам „Дзеяслоў".

Эдуард Акулін:

— Адрозніваюцца яны ад сябе літаратурна-мастацкай прапорцыяй. „Дзеяслоў", як акадэмічнае выданне, скіраваны на друкаванне твораў нашых класікаў, твораў літаратараў сярэдняга пакалення, а пераважная большасць нашых старонак будзе аддадзена маладым. Класікі — два-тры чалавекі на нумар — будуць друкавацца ў нас у якасці літаратурнай школы.

— „Верасень" працягвае слаўныя традыцыі беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісаў, такіх як „Крывічанін", „Калосьсе", „Узвышша", „Крыніца", „Дзеяслоў", — перакананы Леанід Дранько-Майсюк. — Мяркуючы па тым, што ў другім нумары „Верасня" прадстаўлены творы ажно 12 маладых літаратараў (8 паэтаў і 4 празаікі), часопіс фармуе сабе імідж гадавальніка маладых талентаў. У часопіса і прывабліві дызайн, цікавыя здымкі, афармленне раздзелаў. За мастацкае афармленне часопіса адказны малады мастак Юры Круглікаў.

Рыхтуецца чацвёрты нумар часопіса. І тут будзе прадстаўлена каля дзесяткі маладых паэтаў. Свае публікацыі прысылалі і майстры слова, м.інш. Васіль Зуёнак, будзе і інтэрв'ю з Уладзімірам Някляевым. Рыхтуецца і ўнікальны матэрыял — нядаўна адшукаўся невядомы, невыдадзены зборнік паэзіі Анатоля Сыса, які мае загаловак „Берагі майго юнацтва", мае быць надрукавана частка вершаў з гэтага зборніка з прадмовай Алеся Бяляцкага (нумар павінен выйсці ў ліпені).

Мінчане могуць пазнаёміцца з „Вераснем" м.інш. на сядзібе ТБМ, у „Акадэмічнай кнізе", да іншых чытачоў трапляе на сустрэчах арганізаваных м.інш. у межах культурніцкай акцыі „Будзьма беларусамі". Ад ліку чытачоў залежыць ці можа апынуцца гэтае выданне ў падпісцы.

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Гаспадар цацачнай крамы

Я — цацачны гандляр
Уласнік гэтай крамы,
І цацкі — мой тавар
Найпрыгажэйшы самы!
Я не служу казне!
І што мне тут хавацца:
Мы сыдземся ў цане —
Давайце таргавацца!
Цацкі ж не абы-якія:
Не гліняныя — пустыя;
Не драўляныя — глухія...
Цацкі ўсе як ёсць — жывыя!
Бяз лішняй гаманы
Забаву проста з моста
Умеюць даць яны
І дзецям, і дарослым.
У цацак (знаю я!)
Не бзік які ці бздура,
А ў кожнае свая
Адметная натура.
Хто з кім гуляе век
Няведама адвеку:
Ці з цацкай чалавек?
Ці цацка з чалавекам?
Таму звяроў маіх
І птушак не мінайце,
А для дзяцей сваіх
І для сябе купляйце!

Іаанна ЧАБАН

Ажывае мінулае, якое стараліся забыць

Неяк апошнім часам не ўдалося мне пабываць у тэатры. Дзесьці зніклі беларускія п'есы з падмосткаў Беластоцкага драматычнага тэатра, арганізаваныя Генконсульствам Рэспублікі Беларусь у Польшчы. А тут чую, што Згуртаванне АБ-БА аб'язджае не толькі нашы мястэчкі, але і невялікія вёскі з вельмі цікавай пастаноўкай. А мо іх у Крынкі запрасіць? Але ці яны захочуць наведаць гэты куток свету забыты Богам і людзьмі? А ці прыйдуць гледачы? Гэта ж будзе па-беларуску... Крынчане да культуры не звыклі, а да таго яшчэ беларускай...

Ведаючы, што дырэкцыя мясцовай адукацыйнай установы размаўляць са мной не будзе, накіравала я свае крокі да самога бурмістра, які пакуль яшчэ здароўкаецца са мною на вуліцы.

Ён пачаткова падтрымаў маю ініцыятыву і нават абяцаў нейку фінансавую дапамогу. Параіў мне таксама напісаць афіцыйнае пісьмо дырэкцыі школы з просьбай паведаміць дзяцей і моладзь аб мерапрыемстве.

Я звярнулася таксама да дырэктаркі мясцовага Дома культуры з прапановай супрацоўніцтва і тут мяне спаткала вялікая і шчырая прыхільнасць.

Крызіс пачаўся на тыдзень да спектакля, калі я замеціла, што аб'явы, якія мне ў гатовай форме даслала АБ-БА, паздымалі з галоўных пунктаў Крынак, а дырэкцыя мясцовай школы, вядома, не адгукнулася на маю просьбу.

А каб і гэтага было мала, у цэнтры Крынак паявілася свежанькае графіці „Юдэ раўс!". І я адчула сябе як гэтыя жыды.

Думаю сабе: „Канец, трэба адмяніць спектакль. Шкада маладых акцёраў, каб марнавалі прыгожую, веснавую нядзелю на падарожжа ў непрыязныя Крынкі". Пазваніла я Аліне Ваўранюк са сваімі рэфлексіямі, а яна — моцная, відаць, жанчына — зусім не перанялася склаўшайся сітуацыяй і параіла мне ўсё-такі паспрабаваць сарганізаваць мерапрыемства. Напярэдадні выступленняў я яшчэ пазваніла бацюшку з просьбай змабілізаваць прыхаджан да гэтай вельмі важнай і цікавай справы.

У царкве ў нядзелю, у дзень спектакля, падняўся шум і гоман, калі бацюшка пачаў гаварыць аб неабходнасці ўдзелу ў мерапрыемстве. Людзі жыва рэагавалі, распытвалі бацюшку аб недачутых дэталях аб'явы. Дзеткі, якія стаялі за мною, прасілі маму дазволіць ім пайсці паглядзець спектакль, але яна, пабойваючыся за сваю працу ў публічным сектары Крынак, сваёй згоды не давала...

Акцёры паявіліся на некалькі гадзін да спектакля. Прывезлі прафесійную апаратуру, рэквізіты, яшчэ і рэпетыцыю зрабілі.

Пані Эля, дырэктарка нашага дома культуры, заранёў паклапацілася пра абагрэў запушчанага, цёмнага і сырога будынка даўняй каўказскай сінагогі — адзінай глядзельнай залы ў Крынках.

Паступова пачала сходзіцца публіка. Жанчыны ў пенсіённым узросце нясмела запаўнялі апошнія рады скрыпучых крэсел. На сваёй мове каментавалі рэквізіты на сцэне, якія напаміналі іхнюю маладосць.

За лічаныя хвіліны да спектакля зала нечакана напоўнілася гледачамі. У асноўным былі гэта прыхаджане, хаця не бракавала людзей з навакольных мясцовасцей і зусім не звязаных з царквой.

Задавальненнем і надзеяй на лепшую культурную будучыню Крынак я падзялілася з усімі прысутнымі ў час маёй „прадмовы". У клімат спектакля ўвяла нас на беларускай мове Аліна Ваўранюк.

Добра што святло згасілі — было цёмна як у сярэдзіне ночы. Толькі пражэктары, далікатна асвятляючы сцэну, выконвалі ролю месяца на гэтым начным небе. Майстэрская ігра маладых акцёраў і жывыя, часам вельмі сумныя гісторыі, якія прагучэлі са сцэны, выклікалі слёзы ў публікі. У гэтай цемры чуваць было толькі слязлівае смарканне, а мне самой таксама пацяклі слёзы. А мо плакалі таму, што пачулі ў Крынках на сцэне беларускую мову?

Са сцэны плыве апошняя песня... Людзі гучна пляскаюць у ладкі, адважнейшыя гледачы не могуць расстацца з героямі спектакля, дзеляцца сваімі ўражаннямі. „Жывы сцэнарый", — кажа Сакрат Яновіч. Прысутныя ідэнтыфікуюцца з пачутымі гісторыямі, ажывае мінулае, якое мо стараліся забыць, бо нікому яно непатрэбнае. А тут раптам хтось на сцэне паказвае гэта...

А мне да гэтай пары ў галаве гучыць песня „Ой даўно, даўно...".

Фота Барбары ЯКАРСКАЙ

Спектакль „Ой даўно, даўно" адбыўся 08.05.2011 г. у Крынках, дзякуючы арганізацыйнай дапамозе Таварыства „Тэрра Інкогніта" і Гміннага дома культуры

У гродзенскіх палякаў

Адкрыццё Адукацыйнага цэнтра

8 мая было сапраўдным святам польскасці ў Гродне. Даўно не было так важнай падзеі ў жыцці гэтай нацыянальнай меншасці. Пасля пяці гадоў будовы адкрыты быў Адукацыйны цэнтр па вуліцы Гараднічанскай, які працуе ў структуры Польскай мацежы школьнай. Старшыня гэтай арганізацыі Станіслаў Сянкевіч адзначыў, што брак пастаяннага месца перашкаджаў у рэалізацыі ўсіх планаў. У рамках Мацежы дзейнічаюць бібліятэка, Грамадскі ліцэй, Універсітэт трэцяга ўзросту, Клуб польскіх жанчын, Польскі спартыўны клуб „Сокал", Клуб польскіх студэнтаў, Супольнасць „Маладая Палонія". Выходзіць штомесячнік „Słowo Ojczyste" („Роднае слова"). Да гэтай пары не ставала памяшканняў, каб задаволіць усе патрэбы актыўна дзейнічаючай арганізацыі.

Галоўная мэта Мацежы — развіццё польскай асветы шляхам дапамогі ў адукацыі вучняў, якія наведваюць беларускія навучальныя ўстановы, удасканальванне настаўнікаў і прамоцыя польскай мовы і культуры. Намесніца старшыні Мацежы Тэрэса Крышынь адзначыла, што пасляваенная нацыянальная палітыка ў Беларусі давяла да таго, што сёння трэба палякаў вучыць польскай мове так як чужой. Моладзь знаёміцца з роднай мовай перш за ўсё на дадатковых занятках, па-за абавязковай праграмай навучання. Цяпер у Беларусі польскай мове вучыцца 12 020 чалавек у 218 школах. У гэтым ліку толькі дзве ўстановы ў Гродне і Ваўкавыску заняткі для 565 вучняў вядуць на польскай мове.

Адукацыйны цэнтр стварае зусім новыя ўмовы працы. Дзякуючы яму павялічыцца колькасць вучняў Грамадскага ліцэя, якіх зараз налічваецца каля 1,5 тысячы. Лягчэй будзе ладзіць курсы, канферэнцыі, конкурсы, мерапрыемствы. Яніна Казімерская з Падляшскага аддзялення „Вспульноты польскай" адзначыла, што адкрыццё Цэнтра гэта вялікая падзея для Рэчы Паспалітай. Польская мацеж школьная ажыўляе і інспіруе асяроддзе, дае добры прыклад грамадскай ангажаванасці. Паводле раднага Рады горада Беластока Пятра Янкоўскага, новыя офісныя ўмовы ў значнай ступені аблегчаць міжшкольнае супрацоўніцтва. Гэта імпульс для развіцця польскай асветы.

Напярэдадні адкрыцця Адукацыйнага цэнтра адбыліся два конкурсы для школьнай моладзі, арганізаваныя Мацежай пад патранатам Прыродазнаўча-Гуманітарнага ўніверсітэта ў Седльцах. У фінальнай частцы ўдзельнічала 50 вучняў. Журы пад кірункам кс. праф. Рамана Краўчыка вылучыла найлепшых лаўрэатаў. Пераможцамі XVI Гістарычнага конкурсу „Мінулае Польшчы" сталі Аліна Байгужакова (I месца), Станіслаў Гродзель (II месца), Рыгор Гладзілін (III месца), Міраслава Хадароўская і Вераніка Васільева (IV месца). А ў VII Літаратурным конкурсе найлепшымі аказаліся Дар'я Банна (I месца), Анна Качынская і Вольга Чыгер (II месца), Валерыя Скарабагатава і Софія Крэчка (III месца). Галоўнымі прызамі былі заліковыя кніжкі Прыродазнаўча-Гуманітарнага ўніверсітэта ў Седльцах.

Фота Адама АНЁЛКА

Злева: Ксёндз праф. Раман Краўчык, Станіслаў Сянкевіч, біскуп Антон Дзям'янка

Узвядзенне Польскай мацежу школьнай свайго аб'екта і заснаванне ў ім Адукацыйнага цэнтра гэта несумненны поспех. Будынак плошчай 750 квадратных метраў стварае вялікія магчымасці, але не задавальнае ўсіх спадзяванняў. Асвета ў жыцці кожнай нацыянальнай меншасці — гэта вельмі ўражлівая сфера. Патрабуе яна таксама асаблівай падтрымкі, паколькі стварае перспектывы развіцця грамадства. Наглядаючы за гісторыяй гродзенскага цэнтра ўвагу прыцягвае факт, што найбольшае зразуменне арганізатары атрымалі з боку польскай эміграцыі, у прыватнасці ад Фонду імя Зыгмунта Залескага, і грамадскіх арганізацый у Польшчы. Адкрыццё Адукацыйнага цэнтра, якое з'яўляецца несумненным поспехам, не выклікала вялікага зацікаўлення польскіх СМІ. Бо не была гэта відовішчная падзея, хаця выключна карысная, але сёння гэта неабавязкова падыходзіць медыям.

Адам БОБРЫК

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

У ніўскай сям'і

14 траўня „Ніва" адзначыла 55-гадовы юбілей. Калі ў гэты дзень дабіраўся я на ўрачыстасць у беластоцкія „Сподкі", на вуліцы спаткаў Лену Тапалянскую. Прыехала з Трасцянкі. Гэта адна са стойкіх сейбітак роднага слова. Пазнаёміліся мы з ёю ў сямідзесятыя гады на карэспандэнцкіх з'ездах. І па сённяшні дзень застаемся ў ніўскай сям'і. З таго часу трымаліся мы разам. Неўзабаве да кампаніі далучыліся Жэня Мартынюк з Бельска-Падляшскага, Віктар Бура з Гайнаўкі, затым Міхась Куптэль з Сопата і Васіль Петручук з Беластока. Гэта даўнейшы авангард. Да згаданай групы трэба было б прылічыць Мікалая Лук'янюка, Грышу Мароза, Пятра Байко, Мікалая Панфілюка, Марка Цыбарта, як і актыўных супрацоўнікаў апошняга часу — Міхала Мінцэвіча з Орлі, Васіля Сакоўскага з Гайнаўкі ды многіх іншых. Але яны не прыехалі. А шкада, бо такія нагоды рэдка трапляюцца і не вядома ці мы, старэйшае пакаленне, дачакаем чарговых святкаванняў...

Злева: Мікола Ваўранюк, Міхась Куптэль, Аляксандр Максімюк

Не давялося мне спаткаць сябру па пяру Мікалая Краўчука з Пакалі, які абсталяваўся ў Беластоку. Мікола дасылаў у „Ніву" вершы разам з Дзядзькам Квасам. Іхняе гумарыстычна-сатырычнае рыфмаванае слова надоўга заставалася ў памяці чытачоў. З таго часу захаваўся ў дамашнім архіве памятны здымак са з'езда ў 1974 годзе. На ім зняты Уладзімір Хомік са Слоі — І карэспандэнт года, Эдмунд Вайсковіч з Гайнаўкі — ІІ карэспандэнт года ды актыўныя карэспандэнты: Мікола Краўчук і ніжэйпадпісаны. Двух першых ужо не сустрэнем — адышлі ў вечны спачын. У час сёлетніх святкаванняў прысутныя ўшанавалі іх памяць (як і многіх іншых) мінутай цішыні. Прыпомніліся мне тады радкі верша вядомага паэта ксяндза Яна Твардоўскага: „Спяшайма ся любіць людзей, яны ж так хутка сыходзяць".

У банкетным зале за „шведскім сталом" сустрэліся ўдзельнікі юбілейнага мерапрымства — штатныя працаўнікі рэдакцыі і пенсіянеры, шырокае кола сімпатыкаў і супрацоўнікаў „Нівы". Перш за ўсё трэба ўспомніць юбілейны торт, якім абавязкова пачаставаўся кожны ўдзельнік імпрэзы.

Для мяне асабіста юбілейнае спатканне было нагодай для сустрэч з даўнейшымі журналістамі (зараз пенсіянерамі) Георгіем Валкавыцкім, ягонай жонкай Верай (адказным рэдактарам за кантакты з карэспандэнтамі), Міхасём Хмялеўскім, Сакратам Яновічам, Янінай Чэрнякевіч ды славутымі сакратар-машыністкамі Марыяй Федарук і Яўгеніяй Палоцкай. Гэта была таксама нагода для ўспамінаў са славутымі паэтамі Алесем Барскім і Віктарам Шведам. Першы знаёміў мяне з беларускай літаратурай на культурна-асветным семінары ў Супраслі ў 1959 годзе. Віктар Швед у тым жа часе прымаў мяне (як сакратар Галоўнага праўлення БГКТ) на працу ў Гайнаўскім аддзеле Таварыства ў якасці штатнага інструктара. Пасля разам выязджалі мы на аўтарскія сустрэчы.

Як жа цудоўна было ўспомніць мінулыя дні з Алікам Максімюком і Колем Ваўранюком. Такія сябры не забываюцца. Можна спадзявацца на іх бы на Завішу. Яны падтрымалі мяне ў цяжкія мінуты пасля спаткаўшага мяне гора — смерці жонкі. А зараз разам адзначылі мы юбілей свайго роднага часопіса...

Апрача ўспамінаў былі тосты і... песні. Шмат песень. Нашых, беларускіх... Не было пры тым дырыжора. Пявунні самі дабраліся. Цудоўна спявалі... Такія сустрэчы не забываюцца. Але ўсяму бывае пачатак і канец. Так было і ў гэтым выпадку. Калі я збіраўся да дачкі на начлег, падышоў да мяне Коля Ваўранюк.

— А вы, Валодзя, калі дамоў збіраецеся?

— Апошні цягнік у Чаромху ў 15:51 адправіўся. Да дачкі на начлег збіраюся...

— Пачакайце хвілінку... Здаецца, змагу транспарт для вас аформіць...

Праз некалькі мінут Ваўранюк падышоў з сімпатычнай жанчынай.

— Ёля ў Дубічы едзе, — з усмешкай заяўляе калега. — Крышачку паверне, да хаты падвязе...

Такім чынам спаткала мяне прыемнае з карысным: нагода для новага знаёмства з Ёляй Панфілюк з Дубіч-Царкоўных ды факт хуткага і шчаслівага вяртання дамоў.

Падарожжа прайшло хутка і непрыкметна. Паколькі Дубічы ад Чаромхі не за гарамі, згаварыліся пра супольных знаёмых. Прыемна было паўспамінаць мінулыя будні ды загадзя вызначыць нагоду на чарговую сустрэчу з мілай спадарожніцай.

http://prava.vitebsk.cc

Праваабарончая тэма ў Беларусі яшчэ доўга не апынецца на перыферыі грамадскага жыцця. Амаль штодзень незалежныя выданні паведамляюць пра затрыманні, арышты, штрафы ў дачыненні не толькі да палітычных лідараў, але і грамадскіх актывістаў. Адным з прыкладаў таго стала нядаўняя акцыя аўтамабілістаў, што адбылася ў Мінску. Незадаволеныя чарговым павышэннем цэн паліва аўтаўладальнікі перакрылі сваімі машынамі галоўную вуліцу беларускай сталіцы. У выніку свайго яны дамагліся — Лукашэнка быў вымушаны „адкруціць" кошты назад. Але цяпер аўтазмагароў чакае судовы пераслед за выказванне сваёй пазіцыі і, зразумела, пакаранне. Зноў жа без праваабаронцаў, якія будуць дапамагаць грамадскім актывістам, не абысціся.

У некаторых папярэдніх нумарах „Нівы" распавядалася пра сайты, што стварылі ў некаторых гарадах Беларусі мясцовыя суполкі праваабаронцаў. Сёння гаворка пойдзе пра самы паўночны буйны беларускі горад Віцебск.

Сайт „За правы чалавека" месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://prava.vitebsk.cc.** Выглядае ён даволі просценька, але дазваляе даведацца аб тых-сіх палітычных і грамадскіх падзеях, якія адбыліся ў горадзе над Дзвіной і ў віцебскім рэгіёне. Галоўная старонка сайта пабудавана крыху незвычайна — яна падзелена на тры часткі, прычым усе анонсы навін месцяцца на левай — найшырэйшай. Каб прачытаць цалкам якоенебудзь паведамленне, трэба чамусьці клікнуць на слова „Назад", а не „Далей", што было б больш лагічна.

Выйсці на іншыя рубрыкі сайта месцяцца ўверсе, а таксама, што зусім незвычайна, пасярэдзіне галоўнай старонкі. Адна з рубрык, якая павінна распавядаць пра сайт, называецца „Пра нас". Праўда, расповед „пра іх" больш чым лаканічны: „Незалежны інфармацыйны праект, што рэалізуецца праваабаронцамі Віцебскай вобласці. Для кантакту карыстайцеся формай адваротнай сувязі". Форма зваротнай сувязі таксама не мае ніякай персаніфікацыі. Звароты будуць адрасаваныя, відаць, усім праваабаронцам Віцебшчыны. Такія не зусім зразумелыя падыходы да самапрэзентацыі робяць сайт меней сур'ёзным, што вельмі небяспечна для аўтарытэту яго аўтараў і ўладальнікаў.

Выйсце на старонку „Аналітыка" месціца пасярэдзіне выяўлення. Аналітычных артыкулаў у ёй усяго толькі два. Адзін з іх — пад аўтарствам маладзёвага лідара Паўла Севярынца — распавядае пра тое, як ён быў асуджаны да абмежавання волі за ўдзел у акцыі 19 снежня 2010 года. Варта адзначыць, што сайт утрымлівае некалькі артыкулаў цяперашніх асуджаных палітычных актывістаў, якія так ці інакш мелі дачыненне да падзей у дзень апошніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Гэта дазваляе скласці ўласнае меркаванне як аб рэпрэсаваных, так і аб цяперашняй сітуацыі ў беларускай краіне.

Паколькі вельмі шмат значных падзей у Віцебску і яго наваколлях не адбываецца штодня, то для напаўнення карыснай інфармацыяй сайта тамтэйшыя праваабаронцы пазычаюць яе ў праваабарончага цэнтра „Вясна". Прыкладам такіх пазычэнняў з'яўляюцца штотыднёвыя агляды сітуацыі ў Беларусі.

На дадзеным сайце ёсць магчымасць і азнаёміцца з мясцовым папяровым выданнем на праваабарончую тэматыку — бюлетэнем „За правы чалавека" ў pdf-фармаце.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С Беларусі

Полацкая Сафія

У кожнай еўрапейскай краіне ёсць свае знакавыя храмы. У беларускай гісторыі іх досыць шмат. Але нават у ганаровым пераліку найбольш значных культавых пабудоў „зямлі пад белымі крыламі" асаблівае пачэснае месца займае Сафійскі сабор у Полацку. Ён — адвечны сімвал нашага хрысціянства, сцвярджэнне вялікай беларускай культуры, помнік, які часта называюць храмам-феніксам.

Можна сцвярджаць, што той, хто ніколі не быў у старажытным Полацку, не бачыў Беларусі. Бо тут калыска нашай дзяржаўнасці, пачаткі айчыннага праваслаўя, школа старажытнабеларускай архітэктуры. Менавіта Сафійскім саборам у горадзе над Дзвіной пачалося наша манументальнае мураванае дойлідства паводле візантыйскай традыцыі. Варта дадаць, што гэта быў трэці храм такога тыпу на ўсходнеславянскіх землях пасля ноўгарадскай і кіеўскай Сафій, што найбольш яскрава сведчыць пра значнасць і магутнасць старажытнага Полацка.

Першая летапісная згадка пра полацкую Сафію датычыць падзей XII стагоддзя і знаходзіцца ў „Жыціі Еўфрасінні Полацкай". Забудоўваўся сабор князем Усяславам Брачыслававічам, які пазней здабыў сабе мянушку Чарадзей, у другой палове XI стагоддзя. У галоўнай святыні Полацкай зямлі ішлі не толькі набажэнствы. Тут прымалі паслоў, абвяшчаліся мір і вайна, праводзіліся цывільныя рытуалы, перапісваліся кнігі, збіраліся летапісы.

Наступныя пяць стагоддзяў існавання храма адзначаны надзвычай скупымі звесткамі. Вядома толькі, што сабор істотна змяніў сваё аблічча ў сувязі з пастаяннымі войнамі з Масковіяй. Паводле даследніка Міхася Ткачова ён стаў абарончым збудаваннем з чатырма нарожнымі вежамі — полацкая Сафія стала пачынальнікам новага тыпу храмаў.

У канцы XVI стагоддзя храм перайшоў да ўніятаў. Далей ён двойчы гарэў. А ў 1705 годзе падчас Паўночнай вайны, якая была для нас грамадзянскай і калі чужынцы з усіх бакоў дратавалі беларускую зямлю, адбылася трагічная падзея. Расейскі цар Пётр І, якога ў гісторыі суседзяў называюць Вялікім, уласнаручна забіў у сценах сабора шасцярых уніяцкіх святароў і манахаў. Які бандыцкі ўчынак фанатычнага манарха з дзікунскай краіны! Захопнікі пераўтварылі святыню ў стайню і склад парахавых запасаў. Яшчэ праз пяць гадоў расейцы ўзарвалі і сам храм. Да сярэдзіны XVIII стагоддзя сабор быў адбудаваны ў стылі віленскага барока знакамітым архітэктарам Янам Глаўбіцам. Гэта было ўжо трэцяе адраджэнне святыні. Ну а потым прыходзіць чарговая, на гэты раз надзвычай працяглая, расейская акупацыя. У канцы XIX стагоддзя храм занепадае. І толькі ў сямідзесятых гадах наступнага стагоддзя ён пачаў аднаўляцца высілкамі беларускіх архітэктараўрэстаўратараў, якімі кіраваў энтузіяст сваёй справы Валеры Слюнчанка — чалавек, які адраджаў беларускае дойлідства. Першы раз пра ўнікальны храм давялося прачытаць дваццаць гадоў таму якраз з ягонай кніжкі. Сафійскі сабор стаў музеем і канцэртнай залай. У 1985 годзе тут быў усталяваны новы арган працы чэскіх майстроў. Падмуркі ж першаасновы служаць адметнай экспазіцыяй.

Калі зрэдку даводзіцца прыязджаць у Полацак (менавіта так дагэтуль называюць старажытны горад карэнныя жыхары) да студэнцкіх сяброў, мы канешне ідзем у тое месца, „дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель". Дзе на стромым беразе стаіць гэты велічны храм у гармоніі з навакольлем, а каля яго пастаўлены зараз вялізны камень з выбітым крыжам і загадкавымі для сучасніка знакамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Уладзміра СІДАРУКА

Бельскія сустрэчы (5)

Першамайская раніца халодная і хмурная, збіралася на дождж. А 6:45 адправіўся я ў Леўкі. Пры нагодзе Правадной нядзелі задумаў я пагуляць па Бельшчыне. Маршрут пачаў з Раек. Спярша наведаў старажыла Рыгора Яканчука, які распавёў пра баявы шлях з Варшавы ў Берлін у радах Савецкай Арміі.

Мэтай наступнага прыстанку было Мокрае. Па дарозе размінуўся я з аўтамабілем, які павольна рухаўся з процілеглага боку...

Вясковая вуліца прывітала маўклівай цішынёю. Цягнуся па бруку, які запамятаўся мне з шасцідзесятых гадоў. Вось і знаёмая святліца. Тут калісьці дэманстравалі кінакарціны. Зімою зала была неабагрэтая, але шмат людзей прыходзіла, бо кіно тады было ім адзінай культурнай прапановай. У пазнейшы час, калі прыязджаў да жончынай сваячніцы, спаглядаў на апусцелы будынак з разбітымі вокнамі... Зараз не пазнаць даўнейшай святліцы: дах пакрыты каляровай бляхай, занавескі ў вокнах...

Швагеркі не застаў дома. Падаюся ў Дубяжын. На гравейцы сустракаю аўтамабіль, з якім нядаўна размінаўся.

— Ты што, разбіваеш дарогі?... — пачуўся голас з аўтамабіля.

Наблізіўшыся да машыны, пазнаю Вітка Зарэмбу з Кнарыд. Пазнаёміліся мы, калі ў Кнарыды з кінаперасоўкай заязджалі. Прыемна было ўспомніць мінулае, абмеркаваць навінкі.

— А ты дзе пражываеш, чым займаешся? — цікаўлюся.

— Па-даўнейшаму ў Кнарыдах жыву. Прыязджай, — запрашае калега.

Развітаўшыся з кампаньёнам, падаюся ў Дубяжын. Швагер сказаў, што ягоная сястра з Мокрага з сынам у Дубічы-Царкоўныя паехалі. Там у мінулым годзе пахавалі ейнага 47-гадовага Валіка, які ў Грабаўцы з сям'ёю пражываў. Сёння на могільніку памінаюць памерлых. Такая ж багаслужба адбывалася і на могільніку ў Дубяжыне, дзе я па развітанні са шваграм падаўся.

Набліжалася 13:30. Пачаў імжыць дождж. Да адпраўкі цягніка з Рыгораўцаў заставалася больш за дзве гадзіны. Рашыў я заехаць у Дыдулі, якія таксама знаходзіліся на маршруце кінаперасоўкі.

Солтыс Дыдулёў

На першай хаце, з правага боку, прыкмячаю табліцу з надпісам: «Солтыс». Заходжу на панадворак. З дома выйшаў Уладзімір Голуб. Распытваю солтыса пра знаёмых, пра кузаўскую сяброўку па школьнай парце Лідку, затым пра Міхася, даўнейшага начальніка пошты з Рыгораўцаў. Лідка ў шасцідзесятыя гады выйшла замуж і абое з супругам перасяліліся ў дыдулеўскі ПГР. Паколькі члены ПГР не спраўляліся з уборкай ураджаю, карысталіся дапамогай вайскоўцаў з ваеннай часці з Элку. Камандаванне запатрабавала, каб у Дыдулі прыязджала кінаперасоўка.

— А Міхасёва забудова вось гэтая, насупраць, — паказвае солтыс. — Ён у Бельску жыве. Хата пустуе...

— Колькі сядзіб лічаць Дыдулі?...

— Пяцьдзесят восем дамоў, з таго каля дваццаці апусцелых, — адказвае субяседнік. — А сапраўдным земляробам адно майго брата, Анатоля, можна назваць. Ён з'яўляецца гмінным радным і заадно намеснікам старшыні Рады гміны ў Орлі.

— А ваша гаспадарка?...

— Дзевятнаццаць гектараў усяго. Чатыры каровы трымаем, — працягвае суразмоўца. — Прыбытак з таго невялікі, бо плацяць адно па 90 грошаў за літр. Але і гэта грошы...

Уладзімір Голуб солтысам з'яўляецца ўжо другі тэрмін. У час сваёй службы паклапаціўся пра пракладку водаправода на могільнік, жвіраванне кіламетра дарогі ды рамонт святліцы.

— Гэты будынак рамантаваўся ў мінулым годзе, а пабудаваны быў пры знаходжанні на пасадзе кіраўніка гміны Мікалая Зіневіча, — канстатаваў солтыс. — Як пакладуць асфальтавае палатно на дарогу, тады будзе супольнае асвячэнне дарогі і святліцы. Гэта вялікая заслуга нашага войта Пятра Сэльвесюка.

Развітаўшыся з дыдулеўскім солтысам, падаюся ў Градалі, затым на чыгуначную станцыю ў Рыгораўцы. Дождж не спыняўся. Пачакальня забітая дошкамі. Няма дзе схавацца. Праз пятнаццаць мінут падыходзіць рэйкавы аўтобус з Чаромхі ў Беласток. Пагружаюся з роварам, каб выйсці ў Леўках. Там скрываюся ад ліўню пад дахам разбуранага, падшытага ветрам былога памяшкання дзяжурнага руху. Неўзабаве падыходзіць рэйкавы аўтобус у Чаромху. Заходжу з роварам прамоклы да ніткі. У 16:15 на чаромхаўскай станцыі канчаецца мой першамайскі тур па Бельшчыне.

СПАЧУВАННІ

Словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага гора
— смерці Бацькі
— Лукашу Плеве і яго родным
перадаюць сябры і сяброўкі са Зьвязу Беларускай Моладзі.

Словы спачування
Андрэю Гаўрылюку
з прычыны напаткаўшага яго гора
— смерці брата Аляксея
выказвае калектыў рэдакцыі.

Адгаданка

1. металічнае прыстасаванне з загібам на адным канцы, якое можа быць, напрыклад, часткай вуды, 2. дзяржаўны сімвал, напрыклад, аўстрыйскі чырвона-бела-чырвоны, 3. перакананне ў існаванні звышнатуральных сіл, рэлігія, 4. від выяўленчага мастацтва, прымяняючы фарбы, 5. сталіца Рымскай імперыі, 6. левы прыток Сажа ў Суражы, 7. грамадскі актывіст, 8. вялікая балотная птушка (*Ardea*), 9. ноша, якую можна абхапіць рукамі, 10. пасёлак над Асвейскім возерам, 11. цвіце ў ліпені, 12. у яго чэрці пад вачыма, 13. працуе ў кузні.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — пагаворка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 20 нумара

Масква, ноч, арол, сухастой, ясакар, Іўе, накаўт, квант, пуд, ацёк, сцяг, фрагмент.

Рашэнне: **Усякі чорт на сваё кола ваду цягне.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

19.06 — 25.06

(22.03. — 20.04.) Ад 21.06. будзе столькі адбывацца! Не з усім паспееш. У апошнюю дэкаду чэрвеня аддыхнешся. Наладзіш новыя кантакты, пасыплюцца цікавыя прапановы, дзейнасць на некалькіх франтах, зменлівыя сітуацыі. Ды 20-24.06. будзь вельмі асцярожны і лепш не выбірайся далёка.

(21.04. — 21.05.) 19-20.06. — можаш падмацаваць свой бюджэт. Ды не дайся намовіць на падазроную нагоду заробку. Падумай пра ачышчальную дыету. Быкі народжаныя ў красавіку хай не раскідваюцца грашыма і ўвагай для іншых. 20-23.06. не фарбуй валасоў.

(22.05. — 22.06.) Блізняты народжаныя на пачатку чэрвеня не мусяць нічым турбавацца ў пары. Не зарабляйся для пару злотаў больш, пазіцыя на працы ў цябе добрая. У апошнюю дэкаду чакаюць цябе новыя выклікі; добра падрыхтуйся. Ды 19-23.06. не ўсё пойдзе лёгка; але ж праблемы ўсцерагуць цябе перад чымсьці яшчэ горшым.

(23.06. — 23.07.) З 21.06., напоўнены сонечнай энергіяй, рушыш уперад. Не будзе справы, якой не аформіш. Ды не бярыся за новае, не справіўшыся з хвастамі. Будзеш ззяць і біць струмянём будзе з цябе радасць. Ды цяпер твой страўнік вельмі ўражлівы, еж лёгкае.

(24.07. — 23.08.) Не купляй лішняга да 21.06. (новыя выдаткі, але і новыя крыніцы прыбыткаў). З 24.06. (да 28.06.) вялікі аптымізм. Знакамітыя кампанейскія лады. Калі дасі з сябе ўсё, здзейсніш яшчэ больш. Ідзі ўперад, не акопвайся на здабытым. Планеты дадуць напрамак тваёй кар'еры і намецяць новыя шляхі.

(24.08. — 23.09.) 20-22.06. зоркі дадуць табе вялікі імпэт да ведаў, шчасце ў экзаменах. Аптымізм і вера ў сябе. 19-23.06. не прымай да сэрца крытыкі; не паддавайся хандры, адсунься ад нялюбых. 19-21.06. не праваронь непаўторнага шанцу!

(24.09. — 23.10.) 19-20.06. — знакаміты час на заручыны, шлюб. Сувязі наладжаныя цяпер будуць стабільныя. Задбай аб свой выгляд (апошняя дэкада) — будзеш прадстаўляць сваю фірму. Без праблем з крэдытамі і іх сплатамі. Апошняя дэкада чэрвеня — час найбольшых тваіх поспехаў! Ды з 25.06. (да 29.06.) магчымыя непаразуменні з партнёрам; не забывай пра гадавіны!

(24.10. — 22.11.) 20-21.06. асабліва пільнуй свой язык! Скарпіёны, лечыўшыя раны пасля сардэчнай паразы, яшчэ даўгавата не будуць давяраць. Ды прыйдуць табе ў галаву ідэі як добра падзарабіць. Але ж запаволь тэмп, прыкмячай дробныя жыццёвыя хвіліны. Правер узровень гармонаў.

(23.11. — 22.12.) 19-20.06. — пахвалы, поспехі. Не плач над страчанымі знаёмствамі, будуць іншыя. Шмат прапаноў падзарабіць, ды зважай, каб гэта не мяшала галоўнаму занятку. Калі што, хутка можаш знайсці новы (а гэта толькі перспектывы да яшчэ лепшага). Зарабляй, інвестуй, памнажай тое, што маеш.

(23.12. — 20.01.) 19-20.06. — гармонія ў сувязях. Ды 19-23.06. — ненайлепшы час на здаванне экзаменаў і вучобу; будзеш рассеяны, стомлены, перагружаны працай. Варушыся! — пару хвілін зарадкі ў дзень узмоцніць твае мышцы і суставы.

(21.01. — 19.02.) Кругом цябе — амаратараў процьма, можаш натрапіць на свой ідэал. Найудалыя спатканні — з Блізнятамі, Шалямі і Бараном. Моцная падтрымка родных, таксама замежнікаў. Ды з 24.06. (да 28.06.) твая ўпартасць можа ўскладніць кантакты на працы.

(20.02. — 21.03.) Любоўныя зварухі. Задбай пра свой самаход (чакаюць падарожжы). У фінансах няблага (попыт на твае паслугі), але ж пільнуйся з большымі сумамі, з інвестыцыямі; разлічвай на сваю інтуіцыю. 20-24.06. могуць паявіцца неспрыяльныя акалічнасці. Ды можаш у сабе адкрыць празорніцкія ўмеласці!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Мірaслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

КУЛЬТУРА НА СХОДАХ!

Беларускі этнаграфічны фэст, што 5 чэрвеня быў наладжаны на панадворку Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы ў рамках цыкла мерапрыемстваў „Культура на музейных сходах”, розніўся ад мінулагодніх імпрэз разнароднасцю прапаноў. У мінулым перад музейнымі сходамі найчасцей паказвалася адметнасць аднаго даўняга рамяства, якое ўжо занікла або гіне ў паўсюдным жыцці беларусаў Беласточчыны. На гэты раз музейныя ўлады рашыліся паказаць пяць мясцовых заняткаў, а прытым не толькі тыя, якія адыходзяць у забыццё. Паколькі ткацтва, ганчарства, лазапляценне, саломапляценне і дрэваапрацоўка на даўні лад гэта ўжо рэдкасць не толькі сярод кампактна пражываючых на Беласточчыне беларусаў, то выкананне даўніх страў з мясцовай адметнасцю прынамсі на Гайнаўшчыне адраджаецца ў галіне турызму, як у агратурыстычных кватэрах, так і ў мясцовых рэстаранах і пунктах грамадскага харчавання. Многалюдную гайнаўскую публіку зацікавіла таксама, а можа нават перш за ўсё, беларуская музыка. Побач моладзевых музычных калектываў з Беласточчыны з беларускім фальклорам выступіла група „Знаходка” з вёскі Тышковічы на Палессі і гурт „Палац” з Мінска, выступленне якога чакала ў галоўным сярэдняе і малодшае пакаленне. Упершыню арганізатары імпрэзы вырашылі, што калектывы не будуць выступаць даслоўна на музейных сходах, як гэта бывала раней, толькі побач невялікіх бакавых сходкаў і гэтым самым гук моцнай беларускай музыкі накіраваны быў у бок гарадскога парку, дзе можна было яе слухаць, седзячы на лавачках і шпацыруючы па паркавых дарожках. Аднак асноўная публіка сабралася пры музеі. Ззаду за публікай былі расстаўлены палаткі, у якіх можна было купіць народнае рукадзелле, а ў цяньку старых дрэў народнае рамяство паказвалі мясцовыя рукадзельнікі.

Выступленні перад музеем распачалі вучні, якімі апякуецца Вера Масайла, а пасля іх „Беларусачку” праспяваў хлопчык з Прадшколля № 1.

— Прыйшоў да нас бацька і спытаўся, ці не мог бы выступіць яго сын Каміль Вашковяк з песняй „Беларусачка” і мы згадзіліся. Прэзентуем таксама інструментальную музыку з беларускімі мелодыямі ў выкананні вучняў Грамадскай музычнай школы, — заявіў дырэктар музея Тамаш Ціханюк, які прамуе ў галоўным выканаўцаў з Гайнаўшчыны. З беларускай сцэнкай выступілі дзве гайнаўскія белліцэісткі Гося Іванюк і Бася Нядзельская, а маладыя хлопцы з гайнаўскага вакальна-інструментальнага гурту „Метро”, якія выступілі з беларускім рэпертуарам, гэта таксама ў асноўным выпускнікі гайнаўскага белліцэя. Беларускія песні спявалі таксама эстрадныя калектывы „Нарва” з Нарвы, „Дэкада Бэнд” з Бельска-Падляшскага, „Калінка” з Беластока, а традыцыйны фальклор з Палесся запрэзентавала „Знаходка” з Тышковіч каля Янава-Палескага. Усе калектывы на свой спосаб зацікавілі многалюдную публіку.

— Мы падрыхтавалі музыку для ўсіх пакаленняў, — сказаў у пачатку імпрэзы Тамаш Ціханюк. — Сем гадоў ладзім ужо мерапрыемствы пад лозунгам „Культура на музейных сходах”. Сёлета рашыліся аб’яднаць невялікія фэсты ў адзін вялікі, на якім паказваем народныя рамёствы і музыку.

Галоўнай зоркай мерапрыемства быў гурт „Палац” з Мінска, які асабіста запрасіў дырэктар музея Тамаш Ціханюк.

— Гайнаўка — як мой родны горад, бо тут жыве беларускасць, — заявіў перад самым выступленнем лідар гурту „Палац” Алег Хаменка і расказаў пра свае сувязі з Гайнаўкай. — Можна сказаць, што мы спецыяльна прыехалі на музейнае мерапрыемства па запрашэнню майго сябра Тамаша Ціханюка, з якім я знаёмы 16 гадоў, ад часу, калі мы пазнаёміліся на „Басовішчы”. Падабаецца нам тут. На фэсце людзі спяваюць ад шчырага сэрца, як хто ўмее. Гэты ж музей будаваўся на маіх вачах, а я прыязджаў сюды, калі яшчэ тут не было музейнай дзейнасці. Я кантактуюся з Томкам у асноўным па інтэрнэце. Здараецца, што даю і сяброўскія кансультацыі ў справе дзейнасці музея.

Зоркай мерапрыемства быў гурт „Палац” з Мінска

Гурт „Палац” удала выступіў з музыкай у стылі фольк-мадэрн, якую называюць таксама фольк-рокам.

— Бачу вялікае зацікаўленне музыкай. Рамяством перш за ўсё цікавяцца дзеткі і іх бацькі або людзі, якія самі ў мінулым займаліся рукадзеллем, — сказаў віцэ-старшыня аб’яднання „Музей і асяродак беларускай культуры” Ян Карчэўскі, які разам з Паўлінай Паўлючук вялі мерапрыемства.

Дзеткі збіраліся побач месца, дзе можна было навучыцца выконваць гаршкі з гліны. Маладыя асобы пад наглядам інструктара Міраслава Пяхоўскага з Чорнай Вёскі Касцельнай выконвалі невялікую гліняную пасуду, якую пасля маглі забраць дамоў. Дырэктар Тамаш Ціханюк сказаў, што хацеў запрасіць ганчара з Гайнаўшчыны, але так і не знайшоў такіх на сваёй тэрыторыі, бо апошнія, што добра ведалі гэтую прафесію, ужо паўміралі. Можна было таксама купіць гатовыя гаршкі. Непадалёк знаходзіўся музейны ларок з беларускімі кніжкамі, кампакт-дыскамі з беларускай музыкай і кніжкі з праваслаўнымі матывамі. Круціліся людзі побач ларка з духовай стравай, некаторыя рабілі пакупкі, але намнога больш асоб згуртавалася побач месца, дзе былі прапановы для страўніка, а канкрэтна стравы з бульбы. Людзі заказвалі бульбяную „бабку”, дранікі, ці печаную бульбу з каўбасой і смятанай у дадатак.

— Я ўжо каля 50 гадоў выплятаю вырабы з саломы. Прадаю іх таксама і на беларускіх мерапрыемствах. Тут паказваю як плесці простыя вырабы з саломы. Некаторыя цікавяцца маёй работай, — гаварыў Віктар Абрамовіч з Астраўкоў Заблудаўскай гміны.

Цікавыя вырабы народнага рукадзелля прывезла Група творчасці з Брэста. У іх палатцы віселі вышываныя карціны з сучаснымі і даўнімі матывамі. Аднак гэтыя работы якраз прадаваліся слаба ў параўнанні да намнога таннейшых вышываных ручнікоў і сурвэтак, якія таксама прывезлі брэсцкія майстры. Затое не заўважыў я зацікаўлення пакупнікоў кошыкамі з ракіты, выплятаць якія таксама вучыліся маладыя людзі.

— Вырабы з дрэва я прадаю гайнаўскай фірме „Руно”. Мае лыжкі для бані, ці падносы-капанькі, на якой разносяць хлеб у рэстаранах, пасля разыходзяцца па ўсім свеце. Людзі сёння крыху цікавяцца тым, што я раблю, але не было так, каб мяне абступілі людзі, — сказаў Мікола Шыманюк з Гайнаўкі.

Цяжка было б патрабаваць, каб у час канцэрта беларускай музыкі зрабілася многалюдна вакол рамеснікаў. Проста, людзі глядзелі перш за ўсё на тое, што сапраўды іх зацікавіла. Мерапрыемства ладзілася ў рамках святкавання шасцідзесяцігоддзя прысваення Гайнаўцы гарадскога права і з фінансавай падтрымкай гайнаўскага бюджэту, хаця галоўным спонсарам выступіла Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Прадугледжваецца, што ў наступных гадах, так як і сёлета, перад музеем будзе ладзіцца адзін вялікі этнаграфічны фэст з прэзентацыяй рамяствоў і беларускай музыкі, які стане пастаяннай гайнаўскай імпрэзай.

„Лукашэнка, вызвалі Пачобута!” — вялікія рэкламныя банеры з такім заклікам з’явіліся на памежных пераходах польска-беларускай мяжы ў Кузніцы, Баброўніках і Тарэспалі. Галоўным арганізатарам акцыі выступае фонд „Свабода і дэмакратыя”, якому Радыё Рацыя прадставіла сваё месца на рэкламных шчытах.

Працэс над Андрэем Пачобутам распачаўся 14 чэрвеня ў Ленінскім раённым судзе Гродна ў закрытым рэжыме.

Андрэю Пачобуту

Журналістыка — небяспечная прафесія. Незалежныя журналісты недаспадобы ў любой краіне і пры кожнай уладзе. Таму Твая грамадзянская адказнасць за права на свабоду слова ў Беларусі заслугоўвае найвышэйшай павагі. Спадзяюся, што міжнародная і польская супольнасці будуць таксама надалей салідарныя і з усімі беларускімі грамадзянамі, што пацярпелі ад рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, так як у гэты момант мы салідарныя з Табою. Спадзяюся, што хутка прыйдзе той час, калі беспраблемна сустрэнуся з Табою ў Беластоку ці ў Гародні.

Шацунак і павага для Тваёй сям’і і блізкіх. Трымайся.

Яўген ВАПА

ISSN 0546-1960